СОНЦА:
Усход, захад, даўжыня дня:
Мінск — 7.17, 17.30, 10.13;
Віцебск — 7.10, 17.17, 10.07;
Магілёў — 7.06, 17.19, 10.13;
Гомель — 7.01, 17.19, 10.18;
Гродна — 7.32, 17.46, 10.14;
Брэст — 7.29, 17.49, 10.20.
МЕСЯЦ:
Поўня 18 лютага.
ІМЯНІНЫ
Хведара, Захара, Савы; Элеаноры, Фелікса

ЗВЯЗДА

21 ЛЮТАГА 1992 г.
пятніца, № 37 (21815)

● выдаецца са жніўня 1917 г. ● БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА ● цана 50 кап.

РОЗГАЛАС

ВАМ ПАТРЭБЕН СШЫТАК ЗА 16 РУБЛЁЎ?

У гэтыя дні начальнік аддзела забеспячэння і збыту гомельскай фабрыкі «Палесдрук» Аляксандр Іванавіч Статкевіч на работу прыходзіць у шэсць гадзін раніцы і пачынае званіць на Турынскі цэлюлозна-папяровы завод, каб з самага ранку (у Сібіры, як вядома, час ад беларускага адрозніваецца) заспець на месцы дырэктара прадпрыемства ці яго намесніка. Просьба адна і тая: адгрузіце, калі ласка, пісчую паперу. Адказ таксама адзін і той жа: не чакайце, пакуль не выканаеце нашы ўмовы. Якія? Дайце нам халадзільнікі, трактары, МАЗы, тэлевізары. Нядрэнна будзе, калі падкінеце масла, тушонкі, мяса.

І што тут рабіць? Не дапамагаюць ні пісьмы, ні скаргі, ні слёзныя тэлеграмы ў розныя інстанцыі, хоць усе яны ведаюць, што з другога паўгоддзя мінулага года, калі эканамічны і палітычны разлад паміж рэспублікамі былога Саюза набраў разгон, фабрыка «Палесдрук» не выпусціла ніводнага агульнага сшытка. Магчыма, гэты факт не надта ўжо і хваляваў бы, каб не наступная акалічнасць: указаная прадукцыя складае ў агульным аб'ёме вытворчасці прадпрыемства ажно 50 працэнтаў. У выніку летась было недададзена агульных сшыткаў чатыры мільёны штук і скарочана 130 чалавек.

Які ж малюнак зараз? Кошт паперы ўзрос з 700—800 рублёў за тону да 60 тысяч. Адпаведна падскочылі цэны і на прадукцыю фабрыкі. Той жа агульны сшытак, які раней каштаваў 50 капеек, зараз будзе каштаваць... 16 рублёў (паўтараем, яны пакуль што не вырабляюцца з-за адсутнасці паперы). Хто яго купіць, калі для набыцця спатрэбяцца яшчэ і купоны?

— Гэта вельмі балючае пытанне,— гаворыць дырэктар прадпрыемства Рыгор Рыгоравіч Мачульскі.— У нас няма сумненняў, што гандаль у такой сітуацыі ад нашых тавараў адмовіцца. Трэба, каб папярова-белавая прадукцыя пакупніку адпускалася без купонаў.

За студзень калектыў «Палесдруку» аб'ём вытворчасці выканаў усяго на 50,6 працэнта. І то дзякуючы таму, што яго ганцы аб'ехалі ледзь ці не ўсю рэспубліку, наведалі іншыя краіны СНД, шукаючы заказчыкаў, якім трэба надрукаваць бланкі, брашуры і г. д. Абавязковая ўмова — папера заказчыкаў. Вось так фабрыка яшчэ крыху ліпіць.

Але тут рыхтуюцца да горшага: калі па-ранейшаму расійскія цэлюлозна-папяровыя заводы, асноўныя і адзіныя пастаўшчыкі паперы, не дадуць яе, няхай і па дарагой цане,— зноў давядзецца скарачаць штаты.

На вуліцы зноў апынецца не адзін дзесятак друкароў.

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

ІНБЕЛКУЛЬТ: З КОЙДАНАЎСКАЙ ДА КУРАПАТАЎ

Учора з выпадку сямідзесятых угодкаў заснавання Інбелкульта ў Мінску адбыліся дзве памінальныя акцыі. Першая — ля былога будынка гэтай установы па вуліцы Рэвалюцыйнай, 15 (а да рэвалюцыі — Койданаўскай), другая у Курапатах. Гэта сімвалічная згадка пра суровую «адплату» той самаахвярнай інтэлігенцыі, якая закладвала падмуркі цяперашняй Акадэміі навук Беларусі.

Прыгадаем лёс ініцыятараў стварэння, а потым і старшыняў Інбелкульта Сцяпана Некрашэвіча (расстраляны ў 1937 годзе) і Усевалада Ігнатоўскага (скончыў жыццё самагубствам пасля допыту ў 1931 годзе). А Янка Купала, Якуб Колас, Яўхім Карскі, Язэп Дыла, Цішка Гартны, Змітрок Бядуля, Міхайла Грамыка, Язэп Лёсік, Максім Гарэцкі... Многія з сузор'я гэтых талентаў, прысвяціўшы Інбелкульту сваю падзвіжніцкую працу і натхненне, заслужылі потым ганебны ярлык «нацыяналістаў»...

Перад памяццю гэтых людзей схілілі галовы вучоныя, даследчыкі, літаратары, супрацоўнікі навукова-асветнага Скарынаўскага цэнтра, які сёння ўскладае на сябе гонар быць пераемнікам Інстытута беларускай культуры. Паказальна, што Скарынаўскі цэнтр родніць з Інбелкультам не толькі ідэя нацыянальнага асветніцтва, але — нягледзячы на сямідзесяцігадовы разрыў у часе — і бядотнае матэрыяльнае становішча. Сёння 34 супрацоўнікі Цэнтра месяцца ў чатырох невялікіх пакойчыках (адзін з якіх займае бібліятэка) і, зразумела, не без падстаў хацелі б вярнуцца ў духоўна блізкія сцены. Цяпер жа па адрасу Рэвалюцыйная, 15 прапісана шмат кантор — пракуратура, турысцкае бюро, таварыства цвярозасці... Абнадзейвае тое, што Саймін, уніклы ў сітуацыю, усё-такі зрабіў распараджэнне перадаць былы будынак Інбелкульта на службу Навуцы і Асветніцтву. Цяпер слова за сталічным гарсаветам.

Алена ЦІХАНОВІЧ.

Яшчэ адзін крок у Еўропу

ХЕЛЬСІНКІ, (Кар. ІТАР — ТАСС А. Сурыкаў). Кіраўнік Рэспублікі Беларусь Станіслаў Шушкевіч прыбудзе на наступным тыдні з візітам у Фінляндыю. 26 лютага ён ад імя сваёй краіны падпіша Заключны акт Нарады па бяспецы і супрацоўніцтву ў Еўропе, якая адбылася ў Хельсінкі ў 1975 годзе.

На нядаўняй сустрэчы ў Празе міністраў замежных спраў краін, якія ўдзельнічаюць у агульнаеўрапейскім працэсе, 10 дзяржаў, што ўваходзілі ў састаў СССР, былі афіцыяльна прыняты ў члены НБСЕ. Раней да работы асноўнага еўрапейскага форуму па пытаннях бяспекі далучыліся тры прыбалтыйскія дзяржавы. Расія атрымала правы членства ў НБСЕ аўтаматычна, як праваперамніца СССР. Такім чынам, адзінай з былых савецкіх рэспублік, якая застаецца пакуль што па-за рамкамі НБСЕ, з'яўляецца Грузія. Увогуле агульнаеўрапейскі працэс аб'ядноўвае 48 дзяржаў Еўропы, Паўночнай Амерыкі і Азіі.

Папскі нунцый у Мінску

У Мінску з візітам знаходзіцца прадстаўнік Ватыкана ў Маскве папскі нунцый Франчэска Каласуона.

20 лютага ён быў прыняты міністрам замежных спраў Пятром Краўчанкам. У час гутаркі былі абмеркаваны пытанні, звязаныя з устанаўленнем дыпламатычных адносін паміж Рэспублікай Беларусь і Ватыканам.

Зноў аб праблемах армії

Сёння Старшыня Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь С. Шушкевіч выехаў у Ліду, дзе сустрэнецца з афіцэрамі, ваеннаслужачымі вайсковых падраздзяленняў.

Паездка С. Шушкевіча праходзіць на гарачых слядах нядаўняй сустрэчы кіраўнікоў дзяржаў СНД, на якой заключана пагадненне аб сілах агульнага прызначэння на пераходны перыяд.

Падчас сустрэч з вайскоўцамі пойдзе гаворка аб рэарганізацыі ўзброеных сіл Рэспублікі Беларусь, сацыяльнай забяспечанасці і працаўладкаванні тых афіцэраў і прапаршчыкаў, якія трапяць пад скарачэнне.

Мяркуючы па ўсім, С. Шушкевічу прыйдзецца нялёгка. Але гэта і натуральна: ваенная праблема — адна з самых балючых для ўсяго грамадства, не гаворачы ўжо пра вайскоўцаў.

Людміла КЛАСКОЎСКАЯ.

Валюта з дзіцячага вернісажу

ПІНСК. Дзесяткі малюнкаў навучэнцаў Пінскай дзіцячай школы выяўленчага мастацтва былі паказаны на выстаўцы ў Амстэрдаме, а затым прададзены на спецыяльна арганізаваным аўкцыёне. Гэту акцыю правялі галандская арганізацыя «Каачэрэл Экспрэс» і беларуская — «Эка Экспрэс».

Толькі што ў Пінску пабывала госця з Амстэрдама — Жанна Дрысен. Яна паведаміла, што работы юных пінскіх мастакоў экспанаваліся таксама на выстаўках-аўкцыёнах у Іспаніі, Германіі, Вялікабрытаніі. Выручаную валюту выраша накіраваць на будаўніцтва каля возера Байкал пастаянна дзеючага цэнтра па рэабілітацыі дзяцей, пацярпеўшых ад чарнобыльскай катастрофы.

І Ў ІХ БУДЗЕ СХОД

У канцы 1987 года быў звольнены рэгуліроўшчык радыёапаратуры аднаго з заводаў Міхаіл Собаль. Суд не захацеў, а прафком не змог тады аднавіць яго на рабоце. А сёння гэты ж прафком запрашае Міхаіла Собаля — ужо старшыню Канфедэрацыі працы Беларусі — выступіць перад работнікамі завода з лекцыяй па прыватызацыі.

Паводле слоў эксперта Алега Шакалава, у Канфедэрацыю працы штодзённа звоняць дзесяткі людзей, просяць парады, дапамогі па пытаннях, якія датычаць прыватызацыі, скарачэнняў і да т. п. Таму Канфедэрацыя працы Беларусі 22 лютага арганізуе сход рабочых і служачых прамысловых прадпрыемстваў. Мэта гэтай сустрэчы — вызначыць сваё месца, свой інтарэс, свае адносіны і свае гарантыі ў працэсах прыватызацыі. На сходзе, як чакаецца, будуць адказы на пытанні: каму і чым можа дапамагчы прафесіянальны саюз? Хто, як і дзеля чаго бастуе? 40 працэнтаў ад фонду на сацыяльнае страхаванне — што гэта такое?

Сход пройдзе ў Палацы культуры аўтазавода (Партызанскі пр., 117-а) з 13 да 16 гадзін. Запрашаюцца ўсе зацікаўленыя грамадзяне.

БелаПАН.

ГУМАНІТАРНЫ МОСТ ДЗЕЙНІЧАЕ

Учора ў 16 гадзін у Мінскім міжнародным аэрапорце зрабілі пасадку два самалёты адной з італьянскіх кампаній з грузам гуманітарнай дапамогі для Беларусі: з-за мяжы на гэты раз дастаўлены апельсіны і аліўкавы алей.

21 лютага ў Рэспубліканскім таварыстве Чырвонага Крыжа адбудзецца сустрэча прадстаўнікоў грамадскасці, дзіцячых арганізацый Беларусі з ініцыятарамі гэтай міжнароднай акцыі дабрыні. У гэты ж дзень пройдзе сустрэча і ў Вярхоўным Савеце рэспублікі.

МАСТАЦКІ МУЗЕЙ: ЕСЦЬ АПТЫМІЗМ

Калекцыю Дзяржаўнага мастацкага музея высяляць няма куды, а тым не менш існуе дакумент пажарнай аховы, які забараняе выставы з 17 лютага гэтага года. Калекцыя, якая налічвае амаль 22 тысячы экспанатаў, для вока тых, хто цікавіцца мастацтвам, пакуль што недасягальная. Музей мае магчымасць экспанаваць толькі 2—3 працэнты.

— Сёе-тое зрушылася,— гаворыць дырэктар музея Юрый Карачун,—Мы пачалі будаваць прыбудовы да музея. Экспазіцыйныя пляцовак на сённяшні дзень у нас мала, вось і вымушаны былі ўвесь першы паверх аддаць пад захоўванне экспанатаў.

У апошні час зменшылася колькасць наведвальнікаў з-за мяжы, ды і з іншых краін СНД. Палітычныя і эканамічныя змены ў жыцці адыгралі сваю негатыўную ролю. І калі раней мы мелі каля 300 тысяч наведвальнікаў штогод, то зараз гэта лічба зменшылася на трэць. Але магу сказаць адно: хто цікавіўся мастацтвам — я маю на ўвазе, пастаянных наведвальнікаў,— той і сёння да нас прыходзіць.

Два-тры разы ў год наладжваем выставы-продажы, штомесяц праводзяцца аўкцыёны, раз у год — канцэрты класічнай музыкі — новая з'ява ў нашай працы. Збіраецца шмат людзей. Трэба лічыць, што змены добрыя і сваю колькасць публікі далі: з'явіўся так званы рафініраваны глядач, які прыходзіць у музей, напрыклад, толькі на канцэрты. Акрамя асноўнай работы — наладжвання экспазіцый, мы пачалі рэстаўрацыю Мірскага замка, манастырскага падсор'я ў Гальшанах. Рыхтуем пад мастацкую экспазіцыю панскі маёнтак у Лошыцы. Цяжка сказаць, што лепш — вялікая колькасць наведвальнікаў зараз ці забеспячэнне шырокай работы, якая нешта дасць у будучым.

Ігар ШЧУЧЭНКА.

ЗОНА АСАБЛІВАЙ УВАГІ

ДЫПЛАМАТЫЧНАЯ ФІГУРА ЗАМОЎЧВАННЯ

Нататкі з прэс-канферэнцыі ў Дзяржкамчарнобылі Рэспублікі Беларусь

У СВОЙ ЧАС мяне ўразіла публікацыя ў адной з цэнтральных газет, якая ў чымсьці нагадвала фантастычны братоў Стругацкіх. Расказвалася аб Зоне (менавіта так, з вялікай літары), у якую звычайнаму чалавеку трапіць фактычна немагчыма... Два рады калючага дроту, узараная кантрольная паласа, «пагранічнікі» з унутраных войск — у дзіўных белых камбінезонах.

Пускаюць сюды толькі з дазволу Самага Вялікага Начальніка. Нават Прэзідэнта, які быў упэўнены ў сваёй недатыкальнасці, завярнулі ў санпрапускнік, распранулі дагала і выдалі кальсоны з кашуляй і камбінезон. Ахоўнікі пры гэтым шасталі па памяшканню, як кажуць, у чым маці нарадзіла.

Фантастычны малюнак, нейкі апакаліптычны прывід? Размова, між тым, аб звычайных сённяшніх буднях у зоне ядзернай аварыі, якая адбылася ў 1957 годзе каля ўральскага горада Кыштыма.

Праводзілася, вядома ж, і паралель з тым, як будзе выглядаць зона чарнобыльская следу праз дзесяткі гадоў. Магчыма, аўтары таго артыкула ў сваіх параўнаннях і хапілі лішку, але, з другога боку, трэба памятаць, што для распаду радыеактыўных элементаў на глебе і ў вадзе патрабуецца прыкладна трыста гадоў.

Такое вось незайздроснае постчарнобыльскае жыццё чакае ўсіх нас, беларусаў, у зоне нацыянальнай экалагічнай катастрофы. Аднак гэты факт выключнасці нашага існавання чамусьці паступова цьмянее ў самасвядомасці грамадства. Няўжо прыцярпеліся?

ВІДАЦЬ, па сваёй наіўнасці аўтар гэтых радкоў падумаў: калі на прэс-канферэнцыі пойдзе размова аб рэалізацыі дзяржаўнай праграмы па ліквідацыі вынікаў чарнобыльскай катастрофы, дык абавязкова будзе дадзены пэўны аналіз праблем, якія, пачынаючы з таго злашчаснага 26 красавіка, у многім застаюцца ў рэспубліцы нявырашанымі і па сённяшні дзень. Не ўтойваю, было нават прадчуванне магчымай перапалкі паміж яе ўдзельнікамі, узаемных прэтэнзій і абвінавачванняў — прысутнічалі ж дзесяткі кіраўнікоў усемагчымых камітэтаў, міністэрстваў і ведамстваў. Думаю, усе мы мелі права чакаць самай вострай пастаноўкі пытанняў, тым больш, што за паўтара года свайго існавання Дзяржкамчарнобыль рэспублікі праводзіў толькі першую сустрэчу з прадстаўнікамі сродкаў масавай інфармацыі. Дарэчы, гэта акалічнасць была растлумачана тым, што ў яго не было свайго памяшкання.

На жаль, спадзяванні не апраўдаліся. У зале панавала атмасфера акадэмічнай канстатацыі фактаў, пераважная большасць запрошаных засталіся простымі статыстамі арганізаванага прэс-шоу. Праўда, адзін з недахопаў у рабоце Дзяржкамчарнобыля мімаходзь быў адзначаны, аднак пакінем гэта на канец размовы.

Дык што паведамілі грамадскасці? Калі коратка, то наступнае. З зоны з узроўнем забруджвання 40 Кі/км² і вышэй трэба было адсяліць 36,8 тысячы чалавек. Практычна ўсе яны атрымалі новае жыллё, засталіся толькі лічаныя дзесяткі, якіх прыйдзецца яшчэ ўгаворваць, каб яны пераехалі. З 23 тысяч запланаваных кватэр лепш пабудавалі 18 тысяч (трэба мець на ўвазе і перасяленцаў з зоны з узроўнем забруджвання ад 15 да 40 Кі/км²). Заданні ў асноўным сарвалі некаторыя трэсты сістэмы Міністэрства будаўніцтва рэспублікі.

Адзначалася, што кіраўнікі дзяржаў СНД падпісалі адпаведныя дакументы па супрацоўніцтву ў вырашэнні чарнобыльскай праблемы. Падкрэслівалася, аднак, што Украіна ў гэтым плане дапамагаць нам не збіраецца, затое Расія выдзеліла і мільярд 35 мільёнаў рублёў. Прагучалі і скаргі на недахват сродкаў на медыцынскія і навуковыя даследаванні, слабае забеспячэнне медпрэпаратамі і спецыяльным абсталяваннем, на цяжкасці ў аздараўленні насельніцтва.

Аднак усім нам гэта даўно вядома з выступленняў друку і прамоў з трыбун самай рознай вышыні. Якое ведамства, хто канкрэтна з яго кіраўнікоў і чаму за доўгія гады не змог (не вельмі і стараўся?) наладзіць справу на сваім участку — пра гэта размовы не было. А хоць бы адну такую справаздачу было вельмі цікава паслухаць.

Усплылі, праўда, і некаторыя параўнальна новыя факты. Напрыклад, па Віцебскай вобласці. Мясцоваму аблвыканкому пад чарнобыльскую праграму сродкаў было выдзелена дастаткова. Але там замест сучасных пасёлкаў пачалі будаваць у вёсках па адной-дзве кватэры — па-месніцку вырашылі за кошт чарнобыльскіх грошай «закрыць» уласныя праблемы. Сродкі распылілі, а вынікі? Людзі, па вядомых прычынах, пераязджаць у такія раскіданыя «кропкі» не жадаюць. Як кваліфікаваць падобныя дзеянні? З каго спытаць канкрэтна? Адказу няма, ёсць толькі дыпламатычны туман і недасказанасць.

Прабачце, але ж мы недагаворваем ужо амаль шэсць гадоў — з самага дня катастрофы. Замоўчваем прозвішчы асоб, якія ўтойвалі важнейшую інфармацыю аб аварыі, тых, хто «пасадзіў» пасёлак «Майскі» на Магілёўшчыне на забруджанай тэрыторыі, і г. д. Дык што ўсё гэта значыць? Што мы прывыклі ўжо да таго зла, якое высвеціў Чарнобыль? Але ж змірыцца з ім — значыць, апраўдаць яго. Можа, тут і разгадка таго, чаму гадамі марнаваліся горкія чарнобыльскія грошы, якія трапілі ў рукі раўнадушных чыноўнікаў, чаму многія вострыя праблемы перайшлі ў разрад пастаянных?

У адным з адказаў на пытанні журналістаў намеснік Старшыні Саўміна рэспублікі, старшыня Дзяржкамчарнобыля І. Кенік заўважыў:

— Сёння наладжаны даволі жорсткі кантроль за расходаваннем кожнага рубля, адпушчанага на выкананне чарнобыльскай праграмы. У гэтым карэннае адрозненне ад тых падыходаў, якія існавалі нават летась.

Ці няма тут ускоснага прызнання таго бязладдзя, якое захліствала нас усе гэтыя гады? Ці пазбавіліся мы тых прывычак і псіхалогіі?

Да пэўнага роздуму ў гэтым плане падводзіць і самаправаздача (інакш яе не назавеш) міністра аховы здароўя рэспублікі В. Казакова. Ён зачытаў аўдыторыі даведку, нашпігаваную масай лічбаў. Сутнасць яе зводзілася да таго, што сітуацыя з захворваннямі шчытападобнай залозы дрэнная, затое «крывая» па іншых хваробах ідзе ўніз. Ёсць вялікія цяжкасці з лекавымі прэпаратамі, але галіна паспяхова перабудоўваецца ў адпаведнасці з патрабаваннямі моманту.

Увогуле, кіраўнік галіны вольны даваць ацэнку ўзроўню работы падначаленых яму службаў (хоць, зрэшты, ацэнкі могуць быць і іншага плана). Здзіўленне выклікае вось што. Аказваецца, летась узровень забяспечанасці прэпаратамі айчыннай вытворчасці склаў толькі 19 працэнтаў, а сёлета кантрактаў на пастаўку лякарстваў з-за мяжы пакуль што наогул не заключаліся! Да гэтага ў нас яшчэ толькі рыхтуюцца.

Хто праявіў непаваротлівасць? Ці ўрад не выдзеліў на гэтыя мэты пэўнай колькасці валюты? Адказу няма, ёсць зноў-такі канстатацыя факта, якая падаецца пад выглядам аб'ектыўнага адлюстравання сітуацыі. Прабачце, але такая спакойная «аб'ектыўнасць» і трагічная рэчаіснасць існавання ў зоне экалагічнай катастрофы — рэчы несумяшчальныя.

ПРЭСА ЎСЁ МОЖА? Такая думка з'явілася пасля таго, як арганізатары прэс-канферэнцыі звярнуліся да прадстаўнікоў сродкаў масавай інфармацыі з просьбай аб дапамозе. Тут якраз кіраўнікі дзяржкамітэта і ўспомнілі пра той самы недахоп — своечасова не шукалі кантактаў з газетамі, радыё і тэлебачаннем. Што ж, увогуле яны могуць у нечым растлумачыць чытачам і слухачам, як працуе Закон аб сацыяльнай абароне насельніцтва, пацярпеўшага ад аварыі, расказаць аб дзейнасці службаў Дзяржкамчарнобыля, іх праблемах і г. д.

Што для гэтага патрэбна? Толькі поўная шчырасць і адкрытасць — тое, чаго вымагае сама сутнасць нашай галоўнай бяды — чарнобыльскай трагедыі.

Валерый ЧАРНЯЎСКІ.

ПА ПРОСЬБЕ ЧЫТАЧОЎ

Вы атрымалі садовы ўчастак

◆ ПАЧНІЦЕ З ПЛАНІРОЎКІ. Вашы шэсць сотак (калі сям'я з 4—5 чалавек) лепш размеркаваць так: домік павінен заняць не больш за 10 працэнтаў плошчы, агарод —17 працэнтаў, пладовыя культуры — 40, ягадныя — 20, газон, дэкаратыўныя кусты і кветкі — 13. Але, канешне, суадносіны могуць быць і іншыя — усё залежыць ад вашых густаў і намераў.

◆ ПЛАДОВЫЯ ДРЭВЫ І ВЫСОКІЯ КУСТЫ не садзіце каля дома, каб не зацяняць яго. Лепш размясціць тут кветнікі.

◆ ЯГАДНЫЯ КУСТЫ могуць стаць жывой агароджай — размяшчайце іх па краях участка.

◆ ПАКУЛЬ ДРЭВЫ МАЛАДЫЯ, паміж імі можна садзіць суніцы, агародніну— потым іх няцяжка перамясціць на іншыя добра асветленыя месцы.

◆ НЕ ІМКНІЦЕСЯ ГУСТА ЗАСАДЗІЦЬ СВОЙ УЧАСТАК — густыя пасадкі не дадуць высокага ўраджаю. У сярэднім бывае дастаткова пасадзіць 8—10 яблынь ці 20—25 на карлікавых падвоях, 2 грушы, 6—8 вішань ці сліў, 2 рабіны, 2—3 абляпіхі, 6—8 кустоў агрэсту, 12—15 кустоў чорных парэчак, 3—5 чырвоных і белых, каля 50 раслін маліны. 250—300 кустоў суніц — і вы зможаце цалкам забяспечыць ягадамі і фруктамі сваю сям'ю.

◆ РАЗМЯШЧАЮЧЫ АГАРОДНЫЯ КУЛЬТУРЫ, 40 м² плошчы адвядзіце пад раннюю бульбу, 10 м² —пад моркву, пятрушку, буракі. Пад радыс, кроп, салату, шчаўе адвесці 5 м²; пад кабачкі, гарбузы — 10 м²; пад агуркі і памідоры — па 6—8 м², пакінуўшы на іншыя культуры прыкладна 10 м². Як паказвае вопыт, прапорцыі гэтыя самыя рацыянальныя.

◆ ШЫПШЫНУ, РАБІНУ, БАРБАРЫС І АБЛЯПІХУ лепш садзіць па мяжы ўчастка.

◆ МІНУЛЫ ГОД БЫЎ НЕСПРЫЯЛЬНЫМ ДЛЯ ЗБОРУ НАСЕННЯ, шмат якое насенне не выспела. Таму ў продажы яго будзе мала. Паглядзіце свае запасы, абмяняйцеся з суседзямі, праверце сваё насенне на ўсходжасць. **ЗАХОЎВАЮЦЬ УСХОДЖАСЦЬ НАСЕННЕ:** агуркоў, дынь, гарбузоў і кабачкоў — звыш 6 гадоў, бабовых і кукурузы— 5—6 гадоў, капусты, радысу, рэдзькі, рэпы, буракоў і памідораў — 4—5 гадоў, цыбулі, моркву, салаты, шпінату — 3—4 гады; кропу, пятрушкі, каляндры і шчаўя — 2—3 гады, сельдэрэю і пастэрнаку — 1—2 гады.

◆ НЕАБХОДНЫ НАБОР МІНЕРАЛЬНЫХ УГНАЕННЯЎ: суперфасфат ці касцяная мука, сульфат калію, каліевая салетра, мачавіна.

◆ МОЖНА НАБЫЦЬ КОМПЛЕКСНЫЯ УГНАЕННІ — гомельскае, рыжскае, крышталін, ТМАУ (торфамінеральнае аміячнае ўгнаенне), нітраамафоску, нітрафоску.

◆ НЕ ЗАБУДЗЬЦЕСЯ ЗАГАДЗЯ НАБЫЦЬ ЯДАХІМІКАТЫ — медны купарвас, бардоскую вадкасць, хлорвокіс медзі, нітрафен. А таксама вапну.

Дысплей і стомленасць

Парады для тых, хто працуе на камп'ютэрах

Той, хто працуе на дысплеях, іншы раз скардзіцца на боль у вачах, галаўны боль і агульную стомленасць. Як гэтага пазбегнуць? Парады, якія мы вам прапануем, узяты з амерыканскай газеты «Вашынгтон пост».

Перш за ўсё трэба прыняць эручную позу (лепш карыстацца рухомым крэслам). Размясціць цэнтр экрана на 20 градусаў ніжэй за ўзровень грудзей і на адлегласці 35—50 сантыметраў ад вачэй, а неабходныя даведачныя матэрыялы трэба размяшчаць паблізу экрана на той жа адлегласці ад вачэй, каб пазбегнуць частых паваротаў галавы і змянення фокуса вачэй.

Асвятленне павінна быць дастатковым, а каб экран не адсвечваў, можна выкарыстаць настольныя лямпы. Нельга глядзець на экран не міргаючы, а калі вы носіце акуляры, то трэба мець шкло, якое дапускае факусіроўку эроку на ўсе адлегласці.

Пасля кожных дзвюх гадзін умерана напружанай і гадзіны напружанай работы на дысплеі трэба на 15 мінут пераключацца на іншую работу.

МУЖЧЫНЫ, ЗАКАШЫЦЕ РУКАВЫ!

Рабочы куток

Цяжка майстраваць, не маючы пастаяннага рабочага кутка. Але нават калі плошча кватэры не дазваляе яго абсталяваць, не трэба засмучацца: можна зрабіць універсальны стол.



Пісьмовы стол адначасова можа быць і рабочым: адкінута накрыўка стала—і перад вамі рабочы куток, у якім захоўваюцца інструменты, дэталі, прыстасаванні. Для яго вырабу патрабуецца фанера або пліта ДСП таўшчынёй 12—20 мм. Накрыўка стала 3 выразана з матэрыялу таўшчынёй 20 мм. Да накрыўкі прымацавана дэкаратыўная планка 1 — матэрыял таўшчынёй 12 мм — з ручкай 2. Накрыўка мацуецца да асновы стала металічнай завесай 4. Аснова складаецца з задняй сценкі 6, бакавой сценкі 9, дна 8 і сценкі 7 адсека, ніжняй накрыўкі 10 і бакавой сценкі 5. Гэтыя дэталі, акрамя сценкі 5 (таўшчынёй 12 мм), выразаны з матэрыялу таўшчыней 20 мм і злучаны клеем (можна цвікамі ці шрубамі). У час работы ніжнюю накрыўку закрываюць накладкай 12 з гетынаксу, тэксталіту ці іншага тонкага матэрыялу.

Дэталі тумбы выразаны з матэрыялу таўшчынёй 12 мм. Парадак зборкі тумбы такі ж. У бакавых сценках прапілоўваюць пазы, у іх устаўляюць перагародкі і мацуюць заднюю сценку (клеем, цвікамі, шрубамі). Да ніжняй перагародкі прымацоўваюць металічныя фланцы 13 з разьбой і ўкручваюць у іх ножкі (ад тэлевізара, радыёпрыёмніка ці самаробныя).

Затым прымацоўваюць да рабочай часткі стала пракладку 11 і фланцы, укручваюць у фланцы ножкі і злучаюць абедзве часткі стала. Можна ўстанавіць металічную распору (як у радыёлах), якая будзе фіксаваць накрыўку ў вертыкальным становішчы.

У апошнюю чаргу вырабляюць (з матэрыялу таўшчынёй 12 мм) скрынкі — дзве маленькія і адну вялікую. Маленькія скрынкі ўстаўляюць у верхнія адсекі тумбы і захоўваюць у іх пісьмовыя прыналежнасці, вялікую — для інструментаў і дэталей — размяшчаюць у ніжнім адсеку.

Пры пісьме на стол кладуць шкло, каб закрыць шчыліны паміж накрыўкамі.

Цёмную кладоўку можна ператварыць у выдатную майстэрню. Калі цалкам заняць яе пад майстэрню не ўдаецца, выкарыстайце хоць бы верхні бок дзвярэй. Прыбіце да іх паліцы са скрынкамі для дэталей і развесьце інструмент. На ніжняй частцы дзвярэй прымацуйце аднідны столік. У складзеным выглядзе ён займае нямнога месца.

Родная мова, гісторыя, культура — неад'емная частка нашага самаўсведамлення

БЕЛАРУШЧЫНА

ЯШЧЭ АДЗІН ПОГЛЯД

Цярністы шлях этнасу

Як і ад каго паходзіць беларускі народ, як складвалася тэрыторыя Беларусі, хто дапамагаў ёй у гэтым, а хто перашкаджаў, якімі шляхамі развівалася цывілізацыя ў нашай дзяржаве! На гэтыя і іншыя пытанні спрабуе даць адказы Міхась Піліпенка ў сваёй манаграфіі «УЗНІКНЕННЕ БЕЛАРУСІ».

Гэта праца заяўлена як новая канцэпцыя ўзнікнення Беларусі. Яна насычана цікавым пазнавальным матэрыялам не толькі для спецыялістаў — гісторыкаў, этнографаў, мовазнаўцаў, фальклярыстаў, але і для шырокай адукаванай публікі.

Найбольшую цікавасць у кнізе ўяўляе шостая глава, дзе аўтар прасочвае працэс узнікнення беларускай этнічнай тэрыторыі. М. Піліпенка, як нам здаецца, пераканаўча даказвае, што яе ўзнікненне было абумоўлена перш за ўсё трыма важнейшымі фактарамі — гістарычным, эканамічным і палітычным.

Гістарычны фактар выяўляўся ў змянненні знешніх умоў развіцця Папрыпяцця, Панямоння, Падзвіння і Верхняга Падняпроўя (з XIII—XIV і да XV—XVI стагоддзяў на гэтыя землі з захаду нападалі крыжаносцы, а з усходу — татары).

Другім фактарам, лічыць аўтар, з'явілася змяненне эканамічных сувязей названых зямель, больш хуткае развіццё ў гэты перыяд эканомікі Панямоння, Міншчыны, Магілёўшчыны, станаўленне больш цесных сувязей гэтага рэгіёна з папрыпяцкімі і падзвінскімі землямі. Гэта было абумоўлена тым, лічыць даследчык, што Панямонне, Міншчына і суседняе з ёй Падняпроўе ў параўнанні з Папрыпяццю і Падзвіннем знаходзіліся далей ад знешніх ворагаў (татар і немцаў), радзей падвяргаліся нападам, разбурэнням і спусташэнням. Гэты рэгіён і стаў своеасаблівым інтэгрыруючым ядром.

Трэцім важным фактарам узнікнення беларускай этнічнай тэрыторыі, небеспадстаўна лічыць аўтар, быў палітычны — з'яўленне ў XIII стагоддзі новай буйной дзяржавы — Вялікага княства Літоўскага, Рускага і Жэмайцкага, якое аб'ядноўвала ўсходнеславянскае насельніцтва не толькі эканамічна, але і палітычна. Выгаднае становішча цэнтральнага рэгіёна, яго хуткае эканамічнае развіццё было прычынай перасялення сюды асобных груп усходнеславянскага падзвінска-дняпроўскага насельніцтва — з аднаго боку, і папрыпяцкага — з другога, што даказваецца як назвамі шэрагу населеных пунктаў (Палачаны, Тураўшчына), так і антрапалагічнымі данымі. У гэтай жа главе М. Піліпенка ўважліва разглядае працэс утварэння беларускай гутарковай мовы і яе фанетычнай сістэмы. У гутарковай мове насельніцтва папрыпяцкіх, панёманскіх, падзвінскіх і падняпроўскіх зямель, заўважае даследчык, сфарміраваўся шэраг агульных рыс, якія ў іх сукупнасці і камбінацыі з іншымі элементамі мовы сталі адрозніваць яе ад мовы насельніцтва суседніх усходнеславянскіх арэалаў. Даныя лінгвістыкі далі аўтару падставу зрабіць вывад, што беларуская мова як адна з галоўных рыс беларускай этнічнай тэрыторыі аформілася ў XV—XVI стагоддзях. На падставе шматлікіх гістарычных звестак аўтар сцвярджае, што ў гэты перыяд у даным арэале сфарміраваўся новы ўсходнеславянскі (беларускі) этнас з характэрнай для яго матэрыяльнай і духоўнай культурай.

У выніку ўсіх сваіх даследаванняў аўтар прыйшоў да высновы, што ва ўзнікненні этнічнай тэрыторыі беларускага народа важную ролю адыгралі як эвалюцыйныя працэсы, так і дыфузія элементаў культуры і мовы. На думку даследчыка, беларуская этнічная тэрыторыя ўзнікла ў XV—XVI стагоддзях. І першапачатковай агульнай назвай яе быў тэрмін «Белая Русь». Цэнтрам, ядром фарміравання беларускай этнічнай тэрыторыі стала яе сярэдняя частка — панёманскія і падняпроўскія землі, а непасрэднымі вытокамі былі паўднёвая частка падзвінска-дняпроўскай і паўночная частка папрыпяцкай дыялектна-этнаграфічных зон, агульнаўсходнеславянскай этнічнай тэрыторыі. І няма, на думку аўтара, фактычных падстаў браць на веру палажэнні аб фінскім, балцкім і польскім субстратах у фарміраванні беларускай этнічнай тэрыторыі.

Антон ГУРСКІ,
кандыдат філалагічных навук.

З АЛОЎКАМ ПА СЛОЎНІКАХ

Талер маленькі, а даражэнькі

Як і абяцалі ў папярэднім выпуску, сёння мы прапануем яшчэ з тузін руска-беларускіх прыказак і прымавак са слоўніка, укладзенага Зміцерам Санько. Заўважце, у іх вельмі выразна прасочваецца схільнасць кожнага з народаў адлюстроўваць свае назіранні праз уласныя гістарычныя рэаліі і асацыяцыі. Так, слова «сталіца» нагадвала каму Маскву, а каму — Вільню; «грошы»—каму залатнік, каму талер...

Цікава, ці спрабавалі нашы чытачы самі складаць такія прыказкі-пары? У гэту інтэлектуальную гульню маглі б уцягнуцца нават дзеці-школьнікі. Дзяліцеся з намі сваімі лепшымі знаходкамі—мы іх збавязкова надрукуем. У якасці «пробнага шара» прапануем пытанне аднаго нашага чытача: якія беларускія выразы адпавядаюць рускаму «строить глазки»?

Мал золотник, да дорог — Конік маленькі, але даражэнькі — Талер маленькі, а даражэнькі.

Мели, Емели, твоя неделя — Мялі, веспане, пакуль язык не прыстане — Мялі, Апанас, цяпер твой час.

Молодец против овец, а против молодца и сам овца — Зух супраць мух, а супраць зуха і сам муха — Герой бабы старой.

Москва не сразу строилась — Не за дзень Вільня станавілася — Не адразу Вільню пабудавалі.

На безрыбье и рак рыба — Як няма мяса, то і грыб закраса — Калі няма рыб, добры і грыб.

На пузе шелк, а в пузе—щёлк — На назе бот рыпіць, а ў гаршку трасца кіпіць —Хоць без цукру, але ў сподачку.

На семь дворов один топор — и тот без топорища — Сем сёл, адзін вол і той гол —Сем паноў, двое штаноў: хто раней устаў, той штаны ўзяў.

Насильно мил не будешь — Упрошваючы не намілуешся — Даганяючы не нацалуешся.

Нашла коса на камень — Цюк на крук — Чорт на нячысціка наскочыў — Каса на камень наскочыла (трапіла).

Не мытьем, так катаньем — Не кіем, дык палкаю — адной паганялкаю — Калі не дубчыкам, то бізунчыкам.

От трудов праведных не наживешь палат каменных — Не ўзяўшы на душу, не хадзіць у кунтушу.

Ты сударь и я сударь, а кто же присударивать станет — Усё паны ды паны, а свіней няма каму пасці — Я вашасць і ты вашасць, а хто нам хлеба напашаць.

Язык мой — враг мой: прежде ума рыщет — Языча, языча, сабе дабра не зыча — Языча, языча, які чорт цябе кліча? — Свой язык горшы за ліхога суседа.

ЭСЭ-ДАСЛЕДАВАННЕ

Беларускі лёс Арыны Радзівонаўны?

Напачатку гэтыя нататкі могуць выглядаць амаль святатацтвам для свядомасці, у якой прадмет нашай гаворкі замацаваўся інакш. Прапануючы матэрыял, аўтар лічыць неабходным папярэдзіць, што ў яго задачу ні ў якім разе не ўваходзіць намер што-небудзь прысвоіць ва ўласнасць любімага ім краю ці абудзіць непаважлівыя адносіны да чыйёйсьці памяці. Тут перш за ўсё — цікавасць даследчыка.

Калі параўноўваць лёс Арыны Радзівонаўны Якаўлевай, нянькі Пушкіна, з лёсам Беларусі, яны, гэтыя лёсы, вельмі і вельмі падобныя сваёй трагічнасцю, якую парадзілі шчодрасць душы, вялікі мастацкі талент і рабскае становішча ў свеце. Праўда, у даным выладжу пра рабства людзі неяк стараюцца не гаварыць, і таму ствараецца ўражанне, што яго нібыта і не было: наадварот, мы аказваемся ў палоне ідылічных уяўленняў аб гэткім цёплым і мілым існаванні і чалавека, і краіны пад крылом сваіх зямных гаспадароў. А існаванне гэта — ой, якое нялёгкае. Менавіта такім было яно і ў Арыны Радзівонаўны.

Мала хто ведае, што нянька Пушкіна сама мела чатырох дзяцей ад мужа Хвёдара Мацвеева, карэла па нацыянальнасці (памёр у 1798 г.): Ягора (1782 г.); Надзею (1788 г.), у будучым жонка дзядзькі Пушкіна —прыгоннага Мікіты Казлова; Марыю (1789 г.); Стэфана (1798 г.). І што, калі яна карміла сваіх дзяцей, ёй было загадана ўласнымі грудзьмі выкарміць панскіх дзяцей: Вольгу і Аляксандра. Апроч гэтых двух, яна карміла яшчэ некаторых з пяцярых дзяцей Пушкіных (яны ў маленстве памерлі). Самага малодшага, восьмага — Льва — толькі даглядала. Памералі дзеці і ў яе; тады яна карміла толькі панічоў. Пры кармленні была чарга: спачатку панскія дзеці, а потым ужо свае. Трэба сказаць, што бацькі паэта, як, відаць, і большасць людзей гэтага асяроддзя, мала займаліся сваімі дзецьмі, перадаручаючы іх нянькам і наёмным настаўнікам.

Па кодэксу маралі і гаспадарчай раскладцы тых часоў прыгонныя такога рангу, як нянька, мелі вельмі абмежаваную магчымасць гадаваць сваіх маленькіх дзяцей, не гаворачы ўжо пра ўнукаў; больш таго — разлучанасць праследавала і бацькоў, і дзяцей на працягу ўсяго іх жыцця. І часта любоў да сваіх дзяцей у прыгонных пры такіх абставінах знаходзіла выйсце ў любові да панскіх дзяцей. Паны гэта вельмі добра засвоілі.

...Уважліва ўчытайцеся ў верш Пушкіна «Няне», і вы адчуеце стан адзінокай чалавечай душы. Ці не таму Арына Радзівонаўна пры яе лірычным таленце часам зазірала ў кілішак? Нас зачаровае прыгажосць верша «Зимний вечер», але колькі там тугі і нязбыўнага душэўнага болю. І гэта пры тым, што там дзве жывыя душы, і келіх, і віно. Хто, надзелены шчодрасцю і спагадлівасцю да іншых, не хацеў бы таго ж для сябе?! Ды дзе там! Яе, такой шчодрасці, не выяўляецца. Інакш ведалі б мы сёння, дзе пахавана нянька паэта.

Летам 1828 года Арына Радзівонаўна пераехала з Міхайлаўскага ў Пецярбург да толькі што выйшаўшай замуж Вольгі Сяргееўны Паўлішчавай (Пушкінай) і ў тым жа годзе, на 70-м годзе жыцця, памерла. Дзе яе пахавалі, ніхто не ведае і па сённяшні дзень. Адны сцвярджаюць, што на Смаленскіх могілках, другія — што на Мала-Охцінскіх (і тыя, і другія ў Пецярбургу), трэція — што ў сяле Міхайлаўскім. Але факт: магілы няма. Сам Пушкін жыў яшчэ цэлых дзевяць гадоў пасля смерці сваёй нянькі, але, відаць, і ён не наведаў той сумны ўзгорак. На жаль, нам пра тую магілу не змаглі паведаміць ні дзеці, ні ўнукі, ні праўнукі... самой Арыны Радзівонаўны. Дык што ўжо тут гаварыць аб велізарным, планетарнага размаху арэале пушкінскай радні: гэта іншы сацыяльны ўзровень. Каб усё гэта выглядала інакш, каб было вядома месцазнаходжанне магілы, то не пісаў бы паэт, сябар Пушкіна, М. М. Языкаў у 1830 годзе ў вершы «На смерть няни Пушкина»: «Я отыщу тот крест смиренный...» Нельга не заўважыць, што тут жа Языкаў гаворыць і пра ўплыў Арыны Радзівонаўны не толькі на Пушкіна, але і на паэтаў яго асяроддзя.

І ўсё-такі чым жа вытлумачыць такія адносіны да жанчыны, якая адыграла выключную ролю ў фарміраванні дзіцячых уражанняў паэтычнага генія, да жанчыны, якую гэты геній, паводле слоў роднай сястры паэта, палюбіў з дзяцінства і ацаніў яе дар, калі жыў на выгнанні ў Міхайлаўскім? Неабходна адзначыць, што ад Арыны Радзівонаўны захаваліся ў запісах паэта сем казак і дзесяць песень. Казкі пра цара Салтана, пра папа і пра яго работніка Балду таксама падарыла Пушкіну яго нянька. Сюжэты некаторых казак Арыны Радзівонаўны паэт прэзентаваў сваім сябрам, напрыклад, пра цара Берандзея— В. А. Жукоўскаму. Як сведчыла тая ж сястра Пушкіна — Вольга Сяргееўна, нянька па-майстэрску расказвала казкі, ведала некаторыя павер'і і сыпала прыказкамі і прымаўкамі. Натуральна, што і ў яе будучы паэт вучыўся прыгажосці і вобразнасці рускай мовы. З імем Арыны Радзівонаўны звязаны многія творы паэта. Гэта: «Ах, умолчу ль о мамушке родной...», «Сон», «Зимний вечер», «Няне» («Подруга дней моих суровых...»), «Вновь я посетил...» Шырокую вядомасць імя нянькі Пушкіна набывае пасля таго, як выходзіць у свет у 1828 годзе трэці раздзел «Яўгенія Анегіна», дзе аўтар не ўтойвае, што Арына Радзівонаўна — «оригинал няни Татьяны» — Філіпаўны. Гэта ж датычыцца і вобраза нянькі Уладзіміра Дуброўскага — Арыны Базыровай, а таксама мамушкі царэўны Ксеніі ў «Барысе Гадунове». Дарэчы, «Дуброўскі» напісаны на беларускім матэрыяле; гэта агульнавядома, але ўсё ж яшчэ раз нагадаем пра гэта.

І раптам такі вынік...

Ніхто з сяброў Пушкіна не ведаў, дзе ў знак памяці аб той, што захапіла і іх уяўленне, пакласці свежыя кветкі. Не засталося і прыжыццёвага партрэта Арыны Радзівонаўны, хоць ёю былі зачараваны ўсе, хто наведваў Пушкіна ў яго нялёгкія часы. Партрэт нянькі не з'явіўся і пасля яе смерці (пры жыцці паэта). А тады ж было модным замаўляць партрэты — і свае, і сваіх блізкіх.

Чаму так? Звычайныя няўважлівасць і няўдзячнасць? Чыясьці зайздрасць і рэўнасць? Нездарма пляменнік Пушкіна Л. М. Паўлішчаў у сваіх «Успамінах» пра дзядзьку скардзіцца на тое, што біёграфы і сябры празмерна перабольшвалі ролю непісьменнай сялянкі-нянькі Арыны Радзівонаўны ў паэтычным лёсе паэта. Наадварот, ён звыш меры процінастаўляе гэтаму ўплыў на Пушкіна-дзіця сваёй маці Вольгі Сяргееўны.

А можа, яшчэ што?!

Усё можа быць на гэтай зямлі...

Яўген ГУЧОК.

У наступную пятніцу ў чарговым нумары «БЕЛАРУШЧЫНЫ» мы прадоўжым публікацыю эсэ Я. Гучка.

Вас чакае знаёмства з канкрэтнымі фактамі, якія могуць сведчыць пра беларускае паходжанне нянькі Пушкіна. Але аўтар, як ён і ладкрэслівае, не ставіць задачай «прысвоіць» генія рускай паэзіі, ускормленага грудзьмі «беларускай маткі».

Высновы даследчыка зусім іншыя...

ТАПАНІМІЧНАЯ ЭКСПЕДЫЦЫЯ

За Цітаўкаю—Слабада

Дзесяткі тысяч найменняў на зямлі Беларусі. Яны нараджаюцца, жывуць і паміраюць, далёка не ўсе занатаваны ў слоўніках. Як бы ні хацелі навукоўцы, але пачуць народную гісторыю вёскі ці местачковай вуліцы, хутара ці ўрочышча — складана. Тым больш — колькі іх засталося на цудоўным Палессі за калючым дротам!

Наш аўтар А. Карлюкевіч прыйшоў у рэдакцыю з ініцыятывай: запрасіць чытачоў напісаць пра найцікавейшую і самую адметную з назваў, што зберагаецца ў памяці як змалая Радзіма.

Яго ідэя, на нашу думку, вартая ўвагі.

Нарадзіўся і вырас я на Пухаўшчыне. У невялікай Зацітавай Слабадзе. Чаму Слабада? Школьны настаўнік Андрэй Парфёнавіч Свірыдаў тлумачыў нам, што заснавалі вёсачку вольныя нашы прашчуры. А будаваліся яны за рэчкай Цітаўкай.

Жыхары дзялілі родную вёску ў сваю чаргу на чатыры «канцы» — Разувалаўку, непасрэдна Слабаду, Міршчыну і Прытыку.

За блізкім яшчэ часам была ў гэтых назвах і свая, зразумелая ўсім вобразнасць. Часта ў дыялогах можна было пачуць «жыве на Прытыцы», «прытыцкая дзяўчына», «перасяліўся на Міршчыну», «Волька з Разувалаўкі», «слабадскія хлопцы». Зараз сёе-тое губляецца.

Разувалаўка. З яе цяпер пачынаецца вёска. Бальшак ідзе праз рэчку, прыводзіць да першых хат, да могілак. Налева пойдзеш — уся вёска наперадзе. А справа — нямногія хаціны Разувалаўкі, дзе калісьці стаяла і панская сядзіба. Ды чаму ўсё ж Разувалаўка? Па настроях — гэта ці не самы «агрэсіўны» канец Зацітавай Слабады. Таму, відаць, і назва гэткая, што цёмнай ноччу спрытныя хлопцы разувалі сваіх вяскоўцаў. А некалі ж абутак (амаль што як зараз!) быў самай дарагой рэччу.

Слабада. Старыя вдзюль толькі і лічаць сябе слабадскімі. Цэнтр, аснова. Тут і зроблена спроба адводзіць ад цэнтральнай дарогі ўбок да поля ці да рэчкі нешырокія вулачкі. Па ўсім відаць, што са Слабады сапраўды пачыналася селішча. З кім са слабадскіх ні загаворыш пра ягоную сядзібу, адразу ўспамінаюць, што некалі на гэтым падворку стаяла хата дзеда, прадзеда, а то і прапрадзеда.

Далей, за вясковым клубам, — **Міршчына.** Згодна з паданнем, там абсталяваліся перасяленцы з Міра. Хоць, мажліва, тут сяліліся проста з «міру»— аднекуль здалёк. Што ж гнала іх у новую старонку? Кажуць, наезджыя былі ўсе як адзін стараверы.

Прытыка. Ужо на завяршэнні Міршчыны пачынаецца своеасаблівая планіроўка: вельмі шырокая вуліца, хаты ў асноўным па правы бок, а левы, некалі ўвесь літаральна свабодны, заняты выгакам, забудаваліся ў апошнія дзесяцігоддзі. Нарадзілася Прытыка пасля слабадской бяды. Некалі хаты ў цэнтральнай частцы вёскі збіліся вельмі цесна. Здарыўся пажар і шмат будынін вынішчыў. У далейшым, каб не цясніцца, сталі будавацца за Міршчынай, «прыткнуліся» да яе.

Жыве, расце вёска і зараз. На змену драўляным хатам выстройваюцца цагляныя. І новая вуліца з'явілася. Вось толькі якою назваю яна ўвойдзе ў гісторыю?

Алесь КАРЛЮКЕВІЧ.

ВІТРЫНА

І мінута, і хвіліна

Наш чытач з Барысава Аляксандр Жукоўскі просіць «Звязду» паўплываць на дыктараў радыё, каб яны заўсёды гаварылі толькі «хвіліна», «хвілін». Мінута, на яго погляд, «слова расейскае».

Аляксандрі Мы не згодны з такой пастаноўкай пытання. Няхай будуць у нашай мове абодва гэтыя словы. Сінонімы не толькі ўзбагачаюць. А адценні ў іх значэннях такія. Калі «мінута» (па паходжанні слова лацінскае) азначае звычайна дакладны прамежак часу — 60 секунд, то «хвіліна», «хвілінка» проста кароткі момант, імгненне: ён выйшаў на хвілінку; адну хвіліну, я вам дапамагу. Але такое размежаванне сэнсу слоў, вядома, не строгае, яны могуць замяняць адно другое ў розных сітуацыях. На наш погляд, бяды тут няма.

Хочам прапанаваць ацаніць іншы момант. Ці апраўдана, калі беларускае слова выкарыстоўваецца ў рэкламе ў рускамоўным напісанні? На фотаздымку Я. Пясецкага — вітрына аднаго з кафэ ў цэнтры Мінска.

КУТОК ФОТААМАТАРА

Справа «нараджае» пытанні

Адказваем на пісьмы фотааматараў

М. ЖАРЫНАЎ: «Як вызначыць прыгоднасць раствору фіксажу пасля працяглай работы ці захоўвання?»

Узяўшы невялікі кавалак непраяўленай фотаплёнкі, апусціце яе ў сасуд з растворам фіксажу і адзначце час апускання. Праз 3—4 мін. плёнка павінна набыць празрыстасць. Калі для гэтага патрабуецца больш часу, то фіксаж непрыгодны для далейшай работы.

В. СІДАРЭНКА: «Пасля апрацоўкі негатыўнай чорна-белай фотаплёнкі яна не набыла празрыстасць, хоць адлюстраванне на ёй ёсць з аднаго боку. У чым прычына?»

Прычына — непрыгодны фіксаж. Для ліквідацыі дэфекту зноў змясціце фотаплёнку ў праявачны бачок, наліце ў яго халодную ваду і пакіньце на 10—15 мін. Затым зліце ваду і напоўніце бачок свежым фіксажам. Плёнка стане празрыстай на працягу 3—4 мін.

І. КАРОВІН: «Як пазбавіцца ад слядоў кропляў вады пасля высыхання на негатыўнай фотаплёнцы?»

Пасля таго як прамыўка негатыўнай фотаплёнкі закончана, у бачок з прамывачнай вадой дабаўце 2—3 кроплі дзіцячага шампуня «Сонейка» і пракруціце некалькі разоў катушку. Затым плёнку падвесьце для прасушкі за адзін з яе канцоў. Вада сцячэ, не пакінуўшы на плёнцы кропляў. Аднак час на прасушку павялічыцца прыкладна ўдвая.

Б. МІХАЛЬЧУК: «На ўпакоўцы фотаплёнкі ўказана яе адчувальнасць. Але плёнка з часам губляе яе. Калі ж адпавядае напісанае сапраўднасці: у канцы ці ў пачатку свайго тэрміну?»

Велічыня светаадчувальнасці фотаплёнкі адпавядае той, што пазначана на яе ўпакоўцы, аж да заканчэння гарантыйнага тэрміну, які таксама ўказаны на ўпакоўцы. «Свежая плёнка» мае адчувальнасць некалькі вышэйшую за пазначаную.

С. ТРАСКУНОЎ: «Як адрозніць праяўляючы раствор ад фіксуючага?»

Пры апусканні непраяўленай фотаплёнкі на святле ў праявіцель яна цямнее на працягу 3—4 мін., а ў фіксуючым растворы за той жа час набывае празрыстасць.

Г. БРАДОВІЧ: «Дзе дастаць дыстыляваную ваду для складання фотарастворaў?»

Дыстыляваную ваду можна набыць у аптэцы ці зрабіць яе самому: пры размарожванні халадзільніка збярыце снег і закіпяціце атрыманую з яго ваду.

Д. ХАБІБУЛІН: «Як падрыхтаваць ванначні для апрацоўкі фотапаперы вялікіх размераў?»

Зрабіце 4 драўляныя скрынкі адпаведнага размеру і змясціце ўнутр іх поліэтыленавую плёнку, замацаваўшы яе канцы канцылярскімі кнопкамі.

Э. РАДЫЁНАЎ: «У якіх выпадках трэба карыстацца пры здымках аўтаспускам?»

У большасці сучасных фотакамер уведзена прыстасаванне аўтаспуску, якое націскае на спускавую кнопку затвора праз 10—15 сек. пасля ўключэння прыстасавання. За гэты час фатограф можа заняць месца ў кадры і сам сфатаграфавацца ў кампаніі сяброў ці на фоне пейзажу. Аўтаспускам рэкамендуецца карыстацца пры здымках са штатыва на доўгіх вытрымках (ад 1 да 1/30 сек.).

ХАТНЯМУ МАЙСТРУ

Робім самі...

1. КАБ ПАДВЕСІЦЬ ДА СТОЛІ ЛЮСТРУ, у зробленую на столі адтуліну ўстаўляецца металічная ўтулка з разьбой. У ёй зроблены 2—4 адтуліны, у якіх рухаюцца стальныя пальцы. Знізу ва ўтулку ўкручваецца завостраны на конус болт. Болт рассоўвае пальцы, і яны з сілай упіраюцца ў сценкі адтуліны, за кошт чаго прыстасаванне трывала замацоўваецца ў бетоннай столі.

2. СТОЛЬ БУДЗЕ БОЛЬШ ЗРУЧНА СВІДРАВАЦЬ, калі зрабіць з бруска і дамкрата падпорку для дрэлі.

3. КАБ ТРЫВАЛА ПРЫМАЦАВАЦЬ ПАЛІЦУ АБО КАРЦІНУ ДА СЦЯНЫ з пустацелай цэглы, вазьміце латунную або алюмініевую трубку дыяметрам 6—7 мм і даўжынёй 40—50 мм і на адным яе канцы зрабіце крыж — на крыж два надрэзы глыбінёй 20 мм. Надзеньце трубку на болт дыяметрам 4 мм (каб яго галоўка была па дыяметру не большая за таўшчыню трубкі). Пракруціце ў сцяне адтуліну дыяметрам 6—7 мм, каб прапусціць трубку скрозь сценку пустацелай цэглы. З дапамогай надзетай на болт гайкі прыцягвайце канец балта да сябе. Галоўка балта рассуне разрэзаны канец трубкі і трывала заклініцца ў ім. Адвінціце гайку, навесьце на выступаючы канец балта патрэбны прадмет і зноў навіньціце гайку.

4. КАЛІ СЦЕНКА, НА ЯКОЙ ТРЭБА ШТО-НЕБУДЗЬ ПРЫМАЦАВАЦЬ, НАСТОЛЬКІ ТОНКАЯ, што ні цвік, ні шруба не трымаюцца ў ёй, а мацаванне пры дапамозе балта з гайкай нельга прымяніць, можна выкарыстаць унутраную прыціскную шайбу. Яе форма бачна на малюнку. Зрабіць шайбу можна з бляхі або алюмінію. Прымяняючы гэты спосаб мацавання, трэба быць дакладным у вызначэнні размеру і формы адтуліны ў сценцы. Яе лепш рабіць прамавугольнай, але можна і круглай.

5. ЦВІК, САГНУТЫ Ў ВЫГЛЯДЗЕ ЛІТАРЫ «М», будзе лепш трымацца ў сценцы з фанеры або сухой тынкоўкі.

6. КРАПЕЖНЫМ МАТЭРЫЯЛАМ МОЖА СЛУЖЫЦЬ кавалак гумавай трубкі, устаўлены ў папярэдне зробленае ў сценцы гняздо. Ён дэфармуецца і моцна зацісне болт.



СВАЕ КОЛЫ

Пасля зімовага «адпачынку»

Калі ваш аўтамабіль перазімаваў на адкрытай стаянцы, то перад пачаткам эксплуатацыі яго неабходна раскансерваваць. Пачнём з апрацоўкі кузава і дэкаратыўных дэталей «Хуткадзеючым сродкам з сіліконам». Пасля такой апрацоўкі мыць машыну неабавязкова, трэба толькі распаліраваць плёнку, што засталася. Пасля таго як ачышчана дніща аўтамабіля, уважліва агледзьце дэталі падвескі і рулявой трапецыі. Звярніце ўвагу на цэласнасць гумавых ахоўных чахлоў — калі яны патрэскаліся, абавязкова замяніце іх, інакш грязь хутка разбурыць шарніры. Пераканайцеся ў спраўнасці ўсіх тармазных шлангаў. Папрасіце памочніка некалькі разоў націснуць на педаль тормаза — калі дзе-небудзь з'явіцца ўздуцце, шланг неабходна замяніць.

Раскансервуйце рухавік. Для гэтага здыміце заглушкі з паветразборніка, глушыцеля, свечачных адтулін. Ручкай ці стартэрам пракруціце некалькі разоў каленчаты вал — пераканайцеся, што ўсе рухомыя часткі злучэння свабодныя і масла, залітае ў цылындры восенню, добра змазала сценкі. Давядзіце да нормы ўзровень усіх эксплуатацыйных вадкасцей, устанавіце на месца акумулятарную батарэю, пры неабходнасці зарадзіўшы яе.

Падкачайце бензін ручной помпай, на «Масквічах» наліце яго ў паплаўковую камеру карбюратара — і запускайце рухавік. Засталося праверыць светлавую сігналізацыю, і можна накіроўвацца на тэхагляд.

Гаспадыні на заметку

◆ Калі вы заўважылі, што ў шафе, дзе захоўваецца мука, з'явілася сырасць, пакладзіце некалькі сухіх лаўровых лісцінак. Яны ўсмокчуць сырасць.

◆ **Калі ў шафу, дзе захоўваюцца прадукты, запаўзлі мурашкі, пакладзіце туды сапсаваны лімон. Мурашкі адразу ж знікнуць.**

◆ Плямы ад кавы і чаю, што ўтвараюцца на дне пасуды, лёгка ачышчаюцца анучкай, змочанай у растворы соды з воцатам. Заблішчыць як люстэрка.

◆ **Калі сталовыя нажы пакрыліся ржой, змажце іх алеем і пакіньце на паўгадзіны. Пратрыце наждаком—ад іржы не застанецца і следу.**

РОЗГАЛАС

МЯСА І ВІДОВІШЧАЎ!

ПІНСК. (С. Шапіра). Сведкамі і ўдзельнікамі двух маленькіх свят сталі пінчане. У цэнтры горада, на самым людным месцы, адкрыўся спецыялізаваны магазін па продажу мясных вырабаў. Яго гаспадар — мясцовы мясакамбінат.

Паліцы ўгіналіся ад далікатэсаў. Радавалі вока свежая ялавічына і свініна, сасіскі і сардэлькі, каўбасы розных гатункаў і вэнджаніна, і г. д., і да т. п. Усё гэта — на фоне шыкоўнага інтэр'ера і дэкаратыўнай зеляніны. Самае галоўнае: усё значна танней, чым у магазінах дзяржаўнага гандлю. Дырэкцыя мясакамбіната цвёрда абяцала вытрымліваць такі асартымент штодзённа. Акрамя таго, у бліжэйшы час з'явіцца кафетэрый і аддзел мясной кулінарыі.

А другая падзея — адкрыццё ў горадзе свайго прафесіянальнага гасрасліковага тэатра. 38 гадоў назад, калі была ліквідавана Пінская вобласць, скасавалі і мясцовы, добра вядомы тэатр. У новага творчага калектыву вялікія планы: рыхтуюцца адразу дзве прэм'еры для дарослага гледача і адзін спектакль для дзяцей.

КАГО БАЯЦЦА ПАЛЯКІ?

Самая вялікая пагроза для Польшчы цяпер зыходзіць ад Украіны. Такі вынік апытання, праведзенага па заказу «Газеты выборчай» Цэнтрам сацыялагічных даследаванняў (ЦСД) у Сопаце.

Анкеты былі разасланы ва ўсе ваяводствы краіны самым вядомым людзям. На пытанне, каго з шасці суседзяў Польшчы вы больш за ўсё баіцеся, 38 працэнтаў указалі на Украіну, 28 — на Германію, а 15 працэнтаў — на Расію.

На думку палякаў, і Літва можа ўяўляць небяспеку. Так думаюць 10 працэнтаў палякаў, якія прыслалі свае адказы ў ЦСД. Беларусь і Чэхаславакію яны лічаць больш дружалюбнымі дзяржавамі, і таму працэнт пагрозы, паводле даных апытання, невялікі — адведна 4 і 2 працэнты. Толькі 17 працэнтаў апытаных упэўнены, што Польшчы ніхто з краін-суседзяў не пагражае.

Ну, «Стаўбцоўская», пачакай!

Першым у раёне зарэгістраваў прыватнае прадпрыемства пад назвай «Заходняе» Анатоль Мартысюк, былы намеснік дырэктара арганізацыі раённага грамадскага харчавання. Абзавёўшыся свінафермай, ён будуе зараз каўбасны цэх. І абяцае ў красавіку—маі выдаць сваю фірменную прадукцыю. Нарэшце, у мясцовага камбіната кааператыўнай прамысловасці з'явіцца канкурэнт. Магчыма, тады каўбаса «Стаўбцоўская», якую выпускаюць у Камянцы, стане смачнейшай.

Георгій ПАРФЯНОК.

І МІНСК ПРАЗ КОСКУ...

З просьбай аб выдачы амерыканскім уладам банкіра Давыда Багаціна звярнулася пасольства ЗША ў Варшаве ў Міністэрства юстыцыі Польшчы. Ён павінен паўстаць перад амерыканскім судом за ўхіленне ад уплаты падаткаў. Цяпер ён знаходзіцца ў Варшаве пад вартай.

Гісторыя Д. Багаціна стала шырока вядома ў Польшчы. У другой палавіне 70-х гадоў ён выехаў з СССР і пазней атрымаў грамадзянства ў ЗША. Ян высветлілі журналісты польскай «Газеты выборчай», займаючыся аптовым гандлем нафтапрадуктамі, Д. Багацін ашукаў падатковых інспектараў, не заплаціўшы амерыканскай казне каля 7 мільёнаў долараў. Пакуль высвятляліся абставіны справы, ён пераехаў у Аўстрыю, а ў 1987 годзе аказаўся ў Польшчы. Тут ён заснаваў спачатку фірму па закупцы і экспарту маражанай агародніны, а праз тры гады атрымаў ліцэнзію на стварэнне ў Любліне першага камерцыйнага банка з правам продажу акцый. Доля Д. Багаціна ў гэтым банку склала 97,5 працэнта. У хуткім часе банк адкрыў свае філіялы ў некалькіх гарадах Польшчы, а таксама ў Мінску.

Калі стала вядома пра мінулае Д. Багаціна, сярод кліентаў яго банка пачалася паніка. Многія ўкладчыкі забралі з рахункаў свае грошы. Менш сталі звяртацца сюды за крэдытамі.

КАЦЕЛЬНАЯ ЎЗАРВАЛАСЯ

ВЕРХНЯДЗВІНСК. Мінулай ноччу ў вёсцы Валанцы ў памяшканні помпавай кацельнай МПМК-45, якая працуе на вадкім паліве, адбыўся выбух. Разбураны аднапавярховы цагляны дом, парушана цеплазабеспячэнне 180 кватэр, дзіцячага сада, інтэрната і бальніцы. Праз тры гадзіны пажар быў ліквідаваны, урок падлічваецца. Міліцыя расшуквае для дачы паказанняў дзяжурнага аператара кацельнай, месцазнаходжанне якога не ўстаноўлена.

ВЫХОДЗЯЧЫ З ПОЕЗДА, ПЕРАКАНАЙСЯ Ў НАЯЎНАСЦІ ПЕРОНА

Украінская газета «Независимость» расказала вельмі цікавую гісторыю. Пасварыўшыся з жонкай і напіўшыся з гэтай прычыны, электрык кіеўскага Палаца спорту Тарасін аказаўся спачатку на вакзале, а потым і ў поездзе «Бухарэст—Масква».

Ужо на значнай адлегласці ад украінскай сталіцы ў адным з тамбураў «зайца» ўбачыла праваднічка, якая сказала яму знайсці брыгадзіра поезда і набыць білет. У пошуках брыгадзіра Тарасін адкрыў адну за адной некалькі дзвярэй і... выйшаў з поезда, які рухаўся са скорасцю 120 кіламетраў у гадзіну.

«Уявіце здзіўленне дзяжурнай па пераезду побач з платформай Парніковая ў Чарнігаўскай вобласці, да якой звярнуўся падрапаны, не вельмі цвярозы, але абсалютна цэлы пасажыр з просьбай прадаць білет на поезд «Бухарэст—Масква», — піша «Независимость».

БелаПАН.

ВАЙСКОЎЦЫ ВЫЙДУЦЬ З КАЗАРМАЎ

Народных дэпутатаў Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь, якія раніцай 11 сакавіка збяруцца на чарговую сесію, азадачаць сваімі патрабаваннямі вайскоўцы. У гэты дзень а 9 гадзіне раніцы яны збяруцца на мітынг, які будзе праведзены па ініцыятыве Фонду сацыяльнай абароны ваеннаслужачых Рэспублікі Беларусь. На ім мяркуецца паставіць чатыры асноўныя пытанні: пенсіённае забеспячэнне звольненых у запас ваеннаслужачых, калі нарэшце будзе зацверджаны статус ваеннаслужачага, прыняцце закона аб сацыяльнай абароне ваеннаслужачых і членаў іх сем'яў, стварэнне рэспубліканскіх войск процівапаветранай абароны. Створаны каардынацыйны цэнтр, які ўзначаліў сустаршыня Фонду сацыяльнай абароны ваеннаслужачых РБ падпалкоўнік С. Гайдукевіч.

А. СЕЧАНІКАЎ,
карэспандэнт газеты «Воздушный часовой».

АЛЬБЕРВІЛЬ-92

БОЛЬШ БЫ ТАКІХ ДЭБЮТАНТАЎ!

Учора на Гульнях XVI Алімпіяды ў Альбервілі разыграны адзін з апошніх камплектаў узнагарод. На біятлоннай трасе ў 20 кіламетраў са стральбой на чатырох агнявых рубяжах спаборнічалі мужчыны.

Выпраўляючы на спаборніцтвы зборную Садружнасці Незалежных Дзяржаў, трэнеры, функцыянеры спорту і балельшчыкі разлічвалі, вядома ж, хутчэй за ўсё на вопытных і сталых спартсменаў. Хоць, прынамсі, не скідвалі з рахунку і дэбютантаў, якія ў апошнія годзва паспелі добра зарэкамендаваць сябе на міжнароднай арэне. Да такіх, у прыватнасці, адносілі нашых фігурыстаў, якія, дарэчы, і апраўдалі надзеі: Наталлю Мішкуцёнак і Артура Дзмітрыева, Віктара Пятрэнку, Марыну Клімаву і Сяргея Панамарэнку. Не маючы вопыту алімпійскіх баталій, яны не раз бліскуча выступалі на чэмпіянатах свету і кантынента.

А вось біятланіст Яўген Рэдзькін паехаў у Альбервіль амаль нікому невядомым навабранцам. Праўда, спецыялісты ведалі, што два гады назад ён перамог на чэмпіянаце свету сярод юніёраў у гонцы на 15 кіламетраў. Але то былі юніёрскія спаборніцтвы...

Аднак, як высветлілася, не разгубіўся малады біятланіст і ў дарослай кампаніі. Учора ён бліскуча выйграў гонку на 20 кіламетраў і заваяваў залаты алімпійскі медаль. Так 22-гадовы студэнт Беларускага інстытута фізкультуры Яўген Рэдзькін упісаў сваё імя ў алімпійскі летапіс!

У зэкаў таксама ёсць фракі з ордэнамі

У калекцыі буйнейшага савецкага збіральніка татуіровак іх больш як 20 тысяч

Паводле слоў Аркадзя Броннікава, аўтара выстаўкі татуіровак, якая днямі адкрылася ў ДК ГУУС Масквы, цяпер у нас у краіне нацельныя малюнкі маюць халя 20 мільёнаў чалавек. Аднак усе яны, стараючы разам калі не мастацтва, то прынамсі цэлую сферу самавыяўлення, аказаліся выкрэсленымі з гісторыі. За ўвесь час савецкай улады выйшла толькі тры кнігі, прысвечаныя наколкам, — у 20-х гадах, тыражом у некалькі соцень экземпляраў. Да нядаўняга часу гэта тэма лічылася забароненай, і з той пары ёю наогул ніхто амаль не займаўся. На Захадзе ж штогод выходзіць каля 400 манаграфій. Сам А. Броннікаў татуіроўкамі заняўся з 1963 года, будучы экспертам-крыміналістам Пермскага УУС. За 30 гадоў ён сабраў больш як 20 тысяч экспанатаў-фатаграфій. Уменне расшыфроўваць татуіроўкі, на яго думку, прыкметна аблегчыла б работу міліцыі пры зносінах са злачынцамі, ды і простым людзям дасць магчымасць пазбегнуць з імі сустрэчы.

Упершыню ўпамінанне аб татуіроўках як адной з прыкмет злачынцаў сустракаецца ў работах папулярнага ў мінулым стагоддзі італьянскага суддзі псіхіятра і крыміналіста Ц. Ламброза. Менавіта ён, дарэчы, і ўвёў ужываемы нашымі зэкамі выраз, які абазначае наколкі, — «фрак з ордэнамі». Яны, як правіла, тады былі адным з відаў кляйма, што ставілася злачынцам. У Расіі злачынцам выпальвалі «меткі» — з 1649 па 1863 год. На пачатку савецкай улады перадавыя юрысты прапаноўвалі зноў увесці гэту практыку — якраз у выглядзе татуіровак. У 50—60-я гады нашы злачынцы актыўна ўзяліся самі сябе размалёўваць, аднак міліцыя на прафесіянальным узроўні так і не выкарыстала гэты метад барацьбы са злачынасцю. Паводле даных А. Броннікава, татуіроўкі маюць каля 90 працэнтаў сядзеўшых у турмах. Па іх дасведчаны чалавек можа адразу вызначыць, калі, колькі гадоў, за што, на якім рэжыме сядзеў злачынца, яго становішча ў крымінальным асяроддзі, іншы раз нават характар і схільнасці і г. д. і да т. п. Вось самыя распаўсюджаныя наколкі: кожная «ходка», напрыклад, адзначаецца звычайна пярсцёнкам на пальцы, прычым малюнкі на пярсцёнках нясуць яшчэ і іншую інфармацыю. У аднаго са сваіх «кліентаў» А. Броннікаў налічыў 17 пярсцёнкаў. Тое самае — царква за калючым дротам, а колькасць купалоў абазначае, колькі гадоў сядзеў. Васьміканцовыя зоркі на плячах, грудзях або на нагах — уладальнік агрэсіўны да супрацоўнікаў праваахоўных органаў. Арол, які нясе ў кіпцюрах жанчыну, абазначае гвалтаўніка, а калі чамадан — значыць, чалавек заўсёды імкнецца да ўцёкаў. Трэфовы крыж абазначае зладзея-кішэнніка, пагоны на плячах — «аўтарытэт», а званне на іх адпавядае становішчу ў крымінальнай іерархіі і г. д. Размяшчацца наколкі могуць на любой даступнай частцы цела — ад языка да палавых органаў. Насільна наколкі робяцца толькі дзвюм катэгорыям — «апушчаным», пасіўным гомасексуалістам і прайграўшым у карты ў «амерыканку» (на пажаданне). Першым ставяць вочы на жываце, жанчыны ў розных варыянтах на спіне або ягадзіцах, або «мушкі» на твары. З другімі могуць зрабіць усё, што захочацца, — увесь твар размаляваць турэмнымі кратамі або свастыкай і г. д. У свой час некаторыя крымінальнікі размалёўвалі грудзі партрэтамі Леніна, Сталіна, іншых кіраўнікоў, іншы раз усімі адразу. Хадзіла легенда, што, калі прыгавораць да расстрэлу, — у кіраўнікоў страляць пабаяцца.

Тыя, хто робіць татуіроўкі,— так званыя «кольшчыкі зоны» — прафесіяналы, людзі сярод крымінальнікаў вельмі паважаныя. Па наколцы мяркуюць пра чалавека, ад яе залежыць даволі многа. Добрых «кольшчыкаў» мала, і ў асноўным гэта сапраўдныя мастакі. Самы распаўсюджаны інструмент для татуіровак — электра- або завадная брытва. Пасля невялікай пераробкі ў яе ўстаўляюць ампулу для фарбы і іголку, якая рухаецца, як у швейнай машынцы. Фарба ў калоніях рыхтуецца вельмі своеасабліва. Чарніламі наколку рабіць нельга (яны выклікаюць заражэнне крыві), а тушы — ідэальнага фарбавальніка, у калоніях знайсці вельмі цяжка. Часцей за ўсё паляць гуму або ізаляцыю ад кабелю і попел старанна таўкуць. Потым разбаўляюць мачой і перамешваюць. Хоць ёсць і мноства іншых спосабаў наколкі. У некаторых сібірскіх зонах, сведчыць А. Броннікаў, скуру шыюць змочанымі ў фарбе ніткамі, у некаторых — скуру проста надразаюць і заліваюць «фарбай» і г. д. Цікава, што калекцыя А. Броннікава ўяўляе і вялікую навуковую цікавасць. Усе экспанаты анкеціраваны ва ўладальнікаў, класіфікаваны і ўяўляюць стройную сістэму.

Галоўная задача выстаўкі, сказаў аўтар, апрача знаёмства з гэтым мастацтвам, — узброіць супрацоўнікаў, якія змагаюцца са злачынасцю, яшчэ адным карысным вопытам і дапамагчы простым людзям распазнаць злачынцу пры сустрэчы.

А. БАРЫНАЎ.

● РАДЫЁПЕРАХВАТ ● РАДЫЁПЕРАХВАТ ● РАДЫЁПЕРАХВАТ ● РАДЫЁПЕРАХВАТ ● РАДЫЁПЕРАХВАТ ● РАДЫЁПЕРАХВАТ ● РАДЫЁПЕРАХВАТ ● РАДЫЁПЕРАХВАТ ● РАДЫЁПЕРАХВАТ ● РАДЫЁПЕРАХВАТ ● РАДЫЁПЕРАХВАТ ● РАДЫЁПЕРАХВАТ ● РАДЫЁПЕРАХВАТ ● РАДЫЁПЕРАХВАТ ● РАДЫЁПЕРАХВАТ ● РАДЫЁПЕРАХВАТ

РАДЫЁ ПЕРАХВАТ

«ГОЛАС АМЕРЫКІ»

*** Прэзідэнт Злучаных Штатаў Амерыкі Джордж Буш заявіў, што ён гатоў да палітычнай сутычкі са сваім сапернікам Патрыкам Б'екенкам, які атрымаў значную колькасць галасоў на первічных выбарах у адным са штатаў. Буш набраў 58 працэнтаў галасоў, а Б'екенек — 40 працэнтаў. Патрык Б'екенек заявіў, што ён атрымаў вялікую перамогу і цяпер мае права на адкрытыя дэбаты з Бушам па тэлебачанню.**

*** Як паведаміла міністэрства працы ЗША, індэкс цэн на спажывецкія тавары, па якому мяркуюць аб рознічнай інфляцыі, павысіўся ў студзені ўсяго на 0.1 працэнта. У выніку зніжэння цэн на энергію і харчаванне кошт жыцця цяпер на самым нізкім узроўні за апошнія шэсць месяцаў. У другім дакладзе міністэрства працы паведамляе, што пачынае паляпшацца становішча ў такім важным сектары эканомікі, як жыллёвае будаўніцтва. Будаўніцтва новых дамоў павялічылася ў мінулым месяцы на 5,5 працэнта.**

*** Трэці дзень ракетнай і артылерыйскай перастрэлкі ўздоўж ізраільска - ліванскай граніцы прымусіў тысячы ліванцаў пакінуць свае дамы. Ізраільскія сілы выпусцілі тысячы снарадаў па вёсках ліванскіх мусульман-шыітаў, якія, паводле сцвярджэння ізраільцян, даюць прытулак партызанам. Ваенныя дзеянні пачаліся пасля таго, як у мінулую нядзелю ў час ізраільскага рэйду быў забіты лідэр шыіцкай арганізацыі Хезбалах.**

*** Старшыня Расійскага камітэта па занятасці насельніцтва Пракопаў паведаміў, што колькасць зарэгістраваных беспрацоўных рэзка ўзрастае. Сярод фактараў, якія спрыяюць росту беспрацоўя ў Расіі, ён назваў нацыянальныя і іншыя канфлікты ў былым Саюзе ССР. На студзень у Расіі зарэгістравана каля 70 тысяч беспрацоўных.**

РАДЫЁ «ФРАНС ІНТЭРНАСЬЯНАЛЬ [RFI]»

*** Звыш 20 чалавек забіта ў выніку жорсткага артылерыйскага абстрэлу Сцепанакерта. У горадзе шмат пажараў. Есць нямала разбурэнняў, у тым ліку сярод разбураных — парламент і тэлерадыёцэнтр. У горадзе, на які ўпала звыш 200 ракет, шмат параненых.**

*** Чылі заявіла, што былы лідэр ГДР Эрых Хонекер можа прыехаць у Сант'яга, калі Масква аформіць яму дакументы па выезд. Выконваючы абавязкі міністра замежных спраў Чылі Эдмонда Варгас сказаў у інтэрв'ю чылійскаму тэлебачанню, што Чылі не дасць Хонекеру палітычнага прыстанішча. Чылі праследуе толькі гуманітарныя мэты і хоча прадаставіць Хонекеру неабходнае медыцынскае абслугоўванне: Хонекер хворы ракам. Ён з жонкай жыве ў чылійскім пасольстве ў Маскве са снежня мінулага года, каб пазбегнуць дэпартацыі ў Германію.**

*** Дэлегацыя нарады па бяспецы і супрацоўніцтву ў Еўропе вярнулася з Нагорнага Карабаха. Кіраўнік канцылярыі прэзідэнта Чэха-Славакіі Шварцэнберг, які ўзначальваў дэлегацыю, паведаміў журналістам, што ўдалося пранікнуць у Нагорны Карабах і яны ўбачылі жудасныя вынікі вайны. Па словах Шварцэнберга, рэкамендацыі аб выніках гэтай шасцідзённай паездкі будуць прадстаўлены высокапастаўленым прадстаўнікам НБСЕ, якія збяруцца ў Празе 26 лютага.**

*** Германія заявіла, што даруе Польшчы палавіну яе афіцыйных даўгоў, якія складаюць каля 6 мільярдаў долараў, у знак падтрымкі праводзімай варшаўскім урадам эканамічнай рэформы. Міністэрства фінансаў Германіі запэўніла, у прыватнасці, што Польшча будзе мець магчымасць выплачваць астатнія 50 працэнтаў даўгоў на працягу 18 гадоў з працэнтамі па сусветных рынкавых стаўках.**

БІ-БІ-СІ

*** Паводле заявы Прэзідэнта Украіны Леаніда Краўчука, расійскі лідэр Барыс Ельцын не мае права весці перамовы аб скарачэнні стратэгічных узбраенняў са Злучанымі Штатамі Амерыкі ад імя краін СНД. Краўчук заявіў, што ўсе чатыры краіны СНД, на тэрыторыі якіх ёсць гэтыя ўзбраенні, — Расія, Украіна, Беларусь, Казахстан — павінны прымаць удзел у перамовах на роўных умовах. Ельцын, падкрэсліў Краўчук, не быў упаўнаважаны весці такія перамовы ад імя суверэнных дзяржаў. На думку Краўчука, Расія можа скарачаць толькі тыя ўзбраенні, якімі яна валодае. Украінскі прэзідэнт прапанаваў праводзіць працэс скарачэння ядзерных сіл у два этапы. Спачатку, на яго думку, павінны адбыцца перамовы чатырох лідэраў СНД з прэзідэнтам ЗША Джорджам Бушам, а на другім этапе да гэтага працэсу павінны падключыцца кіраўнікі іншых ядзерных дзяржаў свету.**

РАДЫЁ «СВАБОДА»

*** Прэзідэнт Казахстана Нурсултан Назарбаеў выказаў занепакоенасць у сувязі з магчымасцю ўзмацнення ваяўнічага іслама ў Сярэдняй Азіі. На думку прэзідэнта, Расія і Казахстан нясуць асабістую адказнасць у справе абароны дзяржаў Сярэдняй Азіі ад уплыву Ірана. Назарбаеў выступіў на прэс-канферэнцыі ў Вене пасля сустрэчы з канцлерам Аўстрыі Францам Враніцкім. Прэзідэнт Казахстана падкрэсліў, што ён цвёрда выступае супраць спробы стварэння канфедэрацыі сярэднеазіяцкіх дзяржаў. «Наша былая краіна не павінна раскалоцца на дзве часткі — азіяцкую і еўрапейскую ці славянскую і цюркскую», — заявіў Назарбаеў.**

*** Прадстаўніца разведвальнага ўпраўлення Расіі Таццяна Самоліс паведаміла, што разведвальныя службы ЗША і Расіі супрацоўнічаюць з мэтай папярэджвання распаўсюджвання ядзернай зброі і ядзерных тэхналогій, а таксама з мэтай барацьбы з міжнародным тэрарызмам, каркабізнесам і незаконным гандлем зброяй. Акрамя гэтага Самоліс сказала, што абедзве краіны па-ранейшаму займаюцца і прамысловым шпіянажам.**

*** Расійскі міністр сацыяльнай абароны Ала Памфілава заявіла, што мільёны пенсіянераў жывуць за рысай беднасці. 30 мільёнаў пенсіянераў Расіі атрымліваюць усяго па 342 рублі, у той час як пражытачны мінімум у месяц складае 550 рублёў. Памфілава паведаміла таксама, што даходы 90 працэнтаў насельніцтва ніжэй 700 рублёў у месяц.**

ТЭЛЕБАЧАННЕ

21 лютага

Беларускае тэлебачанне.
10.10. «Чырвонае і чорнае». Маст. фільм. 4-я і 5-я серыі.
15.25. Меркурый. Праграма для дзелавых людзей.
16.30. Навіны.
16.35. Педагагічны экран. Выхаванне народнай творчасцю.
17.15. «Дзядулева дудачка», «Дорэмі», «Крэм-брулёе», «Пра Веру і Анфісу». Мультфільмы.
18.00. Дак. фільмы «Імгненні музейнай цішыні», «Імя адной зоркі я паўтараю...»
19.00. Панарама.
19.25. Абласныя навіны (Магілёў).
19.35. Наш каментарый. «Залатыя» боты.
19.40. Якія мы гаспадары? Пінскі завод штучных скур.
20.10. «Спявае Герард Васільеў».
20.25. Калыханка.
20.45. Тэлебіржа.
21.00. Экран беларускага кіно. «Запіскі юнага ўрача».
22.10. НІКа.
22.25. «Чароўнасць», «Куін» у Будапешце». Музычны фільм.

І канал. Астанкіна
10.25. «Салодкія мне родныя гукі». Канцэрт.
10.55. Зімнія Алімпійскія гульні. Лыжны спорт.
13.35. Брыдж.
14.00. Навіны.
14.20. «Валакаламская шаша». Фільм-спектакль.
16.05. Зімнія Алімпійскія гульні. Бабслей.
16.40. Вобраз.
17.00. Навіны.
17.20. Да Міжнароднага тэлемарафона «Салдаты XX стагоддзя супраць вайны».
17.35. Чалавек і закон.
18.15. «Мая сям'я і іншыя жывёлы». 7-я серыя.
18.50. «Поле цудаў».
19.45. Добрай ночы, малышы!
20.00. Навіны.
20.35. «ВІД» прадстаўляе: «Тэма», «Шоў-біржа».
21.50. Зімнія Алімпійскія гульні. Хакей. Паўфінал.
0.30. «Ранішняя зорка» ў начным эфіры.

Канал «Расія»
11.30. Расійскія мецэнаты.
12.30. Рамансы на вершы Ганны Ахматавай.
12.45. Сялянскае пытанне.
13.00. Вестка.
15.00. Грані.
15.45. Прастора плюс.
16.15. Прызнанне ў каханні.
16.30. Прадпрымальніцтва і традыцыі.
16.45. Т. Ін. Ка.
17.00. ТэлеЭКА.
17.30. Праўду слова.
17.45. Версія.
18.00. Астравы разладу. Погляд з Японіі. Частка 2-я.
18.30. «Макар'еў дзень». Дак. фільм.
18.40. Вольны час. «Дамашні клуб».
19.00. Вестка.
19.20. Свята кожны дзень.
19.30. «Санта-Барбара». 26-я серыя.
20.20. На сесіі ВС Расійскай Федэрацыі.
20.50. Дзённік Алімпіяды. Фігурнае катанне.
22.00. Вестка.
22.20. Фігурнае катанне. (Працяг).

22 лютага

Беларускае тэлебачанне
8.30. Раніца распублікі.
8.45. Экран беларускага кіно. «Запіскі юнага ўрача».
9.55. Паказвае Брэст. Мастацка-публіцыстычная праграма.
11.00. Тыдзень планеты.
11.15. Меркурый.
12.15. 20 мінут рэдактара.
12.35. Спявае Міхась Галкоўскі.
13.00. «Любоўныя пісьмы з падтэкстам». Маст. фільм з субтітрамі.
14.30. Голас. Літаратурна-мастацкі відэаканал для школьнікаў. Частка 1-я.
14.55. «Дзяўчынка і леў», «Кубік». Мультфільмы.
15.20. Канцэрт фальклорнага ансамбля «Медуніца».
16.00. Голас. Частка 2-я.
16.45. Медыцына ў тупіку. Што далей? Прымае ўдзел міністр аховы здароўя рэспублікі В. С. Казакоў. Прамая лінія.
18.05. «Трэці анёл затрубіў...» Фільм-прытча.
18.30. Д. Смольскі. Сімфонія № 3.
19.00. Панарама.
19.25. Процістаянне. Маральна-прававая праграма.
20.25. Калыханка.
20.45. Тэлебіржа.
21.00. «Цень папараці». Маст. фільм.
22.30. НІКа.
22.45. Л. Бетховен. Сімфонія № 1. Іграе Дзяржаўны акадэмічны сімфанічны аркестр Беларусі.
23.20. Хакей. «Дынамо» (Мінск) — «Дызеліст» (Пенза).

І канал. Астанкіна
6.30. Суботняя раніца дзелавога чалавека.
7.35. Мультфільмы.
8.05. Дак. фільм «Перад навальніцай».
8.35. «ЭХ». Экалагічная хроніка.
8.50. Цэнтр.
9.30. Ранішняя музычная перадача.
10.00. Гонг.
16.45. «Пчала Мая».
17.10. Фільмы рэжысёра Г. Данелі. «МімікО».
18.45. «Расіні ў Версалі». Канцэртная праграма з удзелам зорак опернай сцэны (Францыя).
19.45. Добрай ночы, малышы!
20.00. Навіны.
20.35. «Па-банку-2, ці Удар у адказ». Маст. фільм (Польшча).
22.00. Зімнія Алімпійскія гульні. Хакей. Матч за 3-е месца.
0.30. «Камічны любоўнік, ці Любоўныя забавы сэра Джона Фальстафа». Маст. фільм.

АЗБУКА ЛЕКАВЫХ РАСЛІН

Вярба

Да вясны — рукой падаць. Сярод першых набрынялых пупышак будуць і карысныя для здароўя.

Вярба белая — дрэва вышынёй 20—25 м і дыяметрам ствала да 3 м, з гібкімі галінамі, ланцэтападобнымі лістамі. Цвіце ў красавіку, пладаносіць у маі. Расце вярба па берагах ручаёў і рэк, паблізу вадаёмаў, уздоўж дарог і ў лесе ў краёўных, асаковых, чарнічных, папаратнікавых і іншых зарасніках. Найбольш распаўсюджаны вербы ў чорнаальховых дрэвастоях на пераўвільготненых глебах. Здаўна сяляне выкарыстоўвалі вярбу для пляцення кошыкаў, умацавання яроў, берагоў рэк, абрываў.

У народнай медыцыне адвар кары вярбы рэкамендуюць пры веснавой астэніі, дрэнным апетыце, паносах, а таксама як процізапаленчы сродак — пры рэўматызме і рэўматычным паражэнні суставаў, падагры. Пры інфекцыйных захворваннях, малярыі яго прымянялі замест хініну. Здымае адвар ліхаманкавы стан, валодае кроваспыняючым, танізуючым, мачагонным, жоўцегонным дзеяннем. Эфектыўны пры гіпертаніі. Як націранне адвар кары выкарыстоўваюць пры скурных захворваннях, трафічных язвах, фурункулёзе, патлівасці ног, для размякчэння мазоляў, пры запаленчых захворваннях слізістых абалонак роту і насаглоткі. Ванны добра здымаюць мышачную стомленасць, дапамагаюць пры туберкулёзе суставаў. Адвар мужчынскіх суквецяў (сабраных ранняй вясной) танізуе дзейнасць сэрца, прымяняецца таксама для лячэння неўрозаў.

Акрамя таго, з вярбы робяць шпагаты, вяроўкі, фарбу, выкарыстоўваюць яе як дубільнае рэчыва ў гарбарнай прамысловасці. Вярба яшчэ і меданосная расліна.

Рыбацкія хітрыкі

◆ Трываласць лёскі можа быць неаднолькавай па даўжыні, таму перад намоткай яе на катушку ці матавільца вады трэба праверыць на расцяжку кожны метр. Сачыце, каб на лёсцы не было вузлоў—яны могуць знізіць яе трываласць больш чым удвая. Вось чаму асабліва на тонкіх (дыяметрам да 0,15 мм) лёсках кавалкі з вузламі лепш адрываць.

◆ Пры моцным ветры і хвалях паспрабуйце лавіць з паплаўком, які мае тонкую і доўгую «антэну». Тоўстая частка паплаўка і большая частка «антэны» знаходзяцца ў вадзе і служаць натуральным баластам, што ўтрымлівае паплавок у вертыкальным становішчы і не дае яму нахіляцца ад хваль.

◆ Каб маленькі кручок не выслізгваў з рук пры насаджванні матыля ці апарыша, раім нацягваць на яго колца ці лапатачку з кавалачка зялёнага кембрыка даўжынёй 2—3 мм. Такі кручок зручна трымаць у руках, а кембрык сваім зялёным колерам нагадвае рыбе травінку і ў нейкай ступені вабіць яе.

◆ Просты і зручны спосаб прыгатавання прынады з аўсяных камякоў дае чэшскі рыбалоў, аўтар кнігі «1000+1 парада рыбалову-аматару» Ярамір Ржыга. Камякі («Геркулес») раскладваюць тонкім слоем на кавалку марлі, потым асцярожна згортваюць яго. Атрыманы рулон паліваюць 2—3 літрамі кіпню (мыць нельга!) да поўнага распарвання камякоў. Потым асцярожна разгортваюць марлю, даюць камякам астыць і злёгку падсохнуць. На кручок насаджваюць кавалачкі ў тым выглядзе, у якім яны адрываюцца ад марлі. Доўга яны не ўтрымліваюцца на кручку, але затое вельмі апетытныя для рыбы.

◆ На некаторых вадаёмах ловяць ляшча, язя, плотку і іншых карпавых рыб на так званыя «бліны» — круглыя плоскія кавалачкі сапраўдных бліноў. Іх робяць загадзя, выціскаючы якой-небудзь трубачкай дыяметрам сантыметр-паўтара, напрыклад, з дапамогай металічнай часткі ад старой аўтаручкі.

◆ Калі раптам у час рыбалкі вам спатрэбіцца блешня з цьмянай ці матавай паверхняй, патрымайце бліскучую прынаду над кавалачкам запаленай бяросты.

◆ Закручаную лёску можна лёгка выправіць, адчапіўшы блешню і распусціўшы лёску з катушкі ў вадзе па цячэнню ці ўслед за лодкай, якая плыве.

МАЙСТЭРНЯ

Чахлы на крэслы

Каб захаваць сядзенні мяккіх крэслаў ад забруджвання, пашыйце чахлы. Зрабіце выкрайку з паперы, накрыўшы ёю сядзенне з прыпускам на раму і 2 см — на падшыўку. Атрымаецца квадрат, два рагі якога надрэжце па шырыні адзін на адзін. Маленькія ражкі, што ўтварыліся, акуратна сшыйце — атрымаецца з абодвух бакоў паглыбленне для пярэдняй часткі сядзення.

З процілеглага боку выкрайкі, звернутай да задніх ножак, зрабіце разрэзы. Менавіта разрэзы, а не выразы, таму што, калі вы падшыеце бакі, у іх свабодна ўвойдуць ножкі крэсла.

Чахол падшыйце з усіх бакоў і асабліва акуратна— з боку задніх разрэзаў.

Калі ўсё гатова, на правым баку надрэзаў прышыйце пяцелькі, на ўнутраным —2 гузікі (гл. малюнак).

Чахлы на крэслы добра зрабіць з дэкаратыўнай тканіны, што пасуе, напрыклад, да вашых фіранак, абруса. Можна зрабіць з гладкай тканіны, аздобіўшы тасьмой з каляровай тканіны.



ВЫКРАЙКА ЧАХЛА НА КРЭСЛА:
а) надрэзы каля пярэдніх ножак;
б) надрэзы каля задніх ножак;
в) падшыўка чахла;
г) пяцелькі;
д) гузікі.

Няблага зрабіць два камплекты чахлоў. Гэта дапаможа зрабіць больш разнастайным інтэр'ер памяшкання; а пакуль адзін камплект знаходзіцца ў пральні, другі захоўвае крэслы ад забруджвання.

СМАЧНА ЕСЦІ!

Так рабілі бабулі

Бывае, што курыца ў супе ніяк не хоча рабіцца мяккай. Тады, паварыўшы яе мінут дваццаць, выцягніце з каструлі і апусціце на тры — чатыры мінуты ў халодную ваду. Потым зноў пакладзіце ў кіпячы булён. І яшчэ: як ні дзіўна, але лепшыя булёны атрымліваюцца з мяса старой дзічыны.

Калі вы смажыце свойскую птушку ў духоўцы, кладзіце яе на бляху ці патэльню спінкай уніз. Тлустую птушку паліце невялікай колькасцю гарачай вады, недастаткова тлустую — растопленым свіным салам. Каб мяса птушкі атрымалася далікатным, перш чым гатаваць, натрыце яе ўнутры і зверху разрэзаным лімонам. Калі ж лімона няма, дабаўце лыжку воцату ў ваду, у якой варыцца птушка.

Варэнікі з бульбай

Замясіце крутое цеста і пакіньце яго на 30 мінут. Зрабіце фарш, для чаго адвараную бульбу трэба размяць гарачай і змяшаць з падсмажанай цыбуляй. Цеста раскатайце ў тонкі пласт, выражце тонкай шклянкай ляпёшкі, пакладзіце на іх фарш і зашчыпніце краі, зрабіўшы варэнікі. Апусціце іх у кіпячую падсоленую ваду. Гатовыя варэнікі ўсплываюць на паверхню. Пры падачы на стол паліце іх маслам ці смятанай.

Для цеста: шклянка мукі, яйка, 1/4 шклянкі вады, соль.
Для фаршу: 300 г бульбы, 2 цыбуліны, 2 сталовыя лыжкі масла.
Для паліўкі: 2 сталовыя лыжкі масла ці 5 сталовых лыжак смятаны.

***

Бульбяное пюрэ не разбаўляйце халодным малаком, ад гэтага яно набывае шэры колер. Перш чым разбавіць пюрэ, закіпяціце малако.

ПРА КАЛЕКЦЫЯНІРАВАННЕ

Філуменія

Збіранне этыкетак ад запалкавых карабкоў — адзін са старажытных відаў калекцыяніравання прадметаў малой графікі. Пачалося яно ў 30-х гадах мінулага стагоддзя з выпускам перш

Dainova Co.,Ltd.

У НАС
ДЛЯ ВАС—
ТЭХНІКА,
ЯКАЯ ДАБАВІЦЬ ПРЭСТЫЖУ ВАШАЙ ФІРМЕ
І ДАДАСЦЬ КАМФОРТУ Ў ПРАЦЫ

● персанальныя камп'ютэры
● прынтэры (фармат А4)
● плотэры (фармат А4)
● тэлефаксы
● ксераксы
● аўтаадказчыкі

● радыётэлефоны фірмы «SNC» (10 нумароў памяці, селектарная сувязь, радыус дзеяння — 500 м).

БУХГАЛТАРАМ І БАНКІРАМ «ДАЙНОВА» ПРАПАНУЕ 12-разрадныя калькулятары з'друкуючым прыстасаваннем і двухколерным друкам фірмы «CASIO».

◆ ДАКЛАДНА Ў ТЭРМІН
◆ ЗА РУБЛІ
◆ ПА ФАКТУ АПЛАТЫ

☎(0172) 588-704

НЕАДКЛАДНАЯ ПАСТАЎКА СА СКЛАДА Ў МІНСКУ

РАДЫЁ

22 лютага

Апошнія паведамленні: 6.00, 7.50, 15.00, 20.00, 23.00.

7.00—раніцны канцерт. 7.25—вершы Ю. Кузняцова. 8.00 — «Суботнім ранкам». Музычна-публіцыстычны выпуск. 9.15 — гуманітарна-інфармацыйны канал радыёстанцыі «Беларуская маладзёжная». Праграма «Радыёкантакт». 10.15 — «На курыных лапках». Літаратурна-забаўляльная перадача. 11.00 — «Фальклор». Радыёклуб. 11.30 — «Сямейнае радыё». (ЗША). 12.00 — «Увайсці ў кожны дом». 13.00 — «Для веруючых і няверуючых». 13.30 — «Філантропы». Хроніка міласэрных і дабрачынных спраў. 13.40 — «Чалавек. Аўтамабіль. Дарога». 14.15 — «З любоўю да роднага слова». Пісьменнік Ф. Янкоўскі аб мове. 14.40 — «Наша радыёбібліятэка». М. Гайдук. «Трызна». Апавяданне. 15.15 — канцерт. 16.05 — «Сябрыка». Радыёклуб для падлеткаў. 17.30 — праграма «Спадчына». 18.00 — перадачы абласнога радыё. 19.45 — вячэрняя казка. 20.00—«Дзень нашага жыцця». 20.30 — «Вячарнія зарніцы». 21.00 — «Музычная пошта». 22.00 — «Паўгадзіны з меламанам». 22.30 — канцертная праграма. 23.10 — «Апладысменты». Музычная праграма.

НА ДВОР'Е

21 лютага

Сёння ўдзень па рэспубліцы воблачнае з праясненнямі надвор'е, месцамі невялікі снег. Тэмпература паветра ў Віцебску, Магілёве — 7—9, Гомелі—6—8, Мінску — 5—7, Гродна — 4—6, Брэсце — 3—5 градусаў марозу.

У наступныя двое сутак: 22-га пераважна без ападкаў, 23-га — уначы па захаду, удзень на большай частцы тэрыторыі снег, тэмпература паветра 22-га ўначы — 13—18, удзень — 4—9, 23-га ўначы — 6—11, па ўсходу да 16-ці, удзень — 2—7 градусаў марозу.

Л. САНКЕВІЧ, інжынер-сіноптык.

Прадаю

дываны 2×3 (Турцыя), пранітку 46—48 нумар. Тэлефон у Мінску 45-35-40.

ГЭТА ПАТРЭБНА ЎСІМ!

ПЕРШАЙ З КРАІН САДРУЖНАСЦІ БЕЛАРУСЬ ПАЧАЛА РАСПРАЦОЎКУ ЎЛАСНАГА КОДЭКСА ЗАКОНАЎ АБ ПРАЦЫ.

ЯГО ГАЛОЎНАЯ ІДЭЯ: РЫНАЧНЫ КЗаП — РЫНАЧНАЙ ЭКАНОМІЦЫ.
Тонкасцямі і асаблівасцямі прымянення новых норм вам дапаможа авалодаць паартыкульны

«КАМЕНТАРЫЙ КЗаПа РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ»,

які рыхтуецца аўтарскім калектывам у саставе:
Г. А. Васілевіча — заг. аддзела па пытаннях заканадаўства і правапарадку Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь, кандыдата юрыдычных навук; В. І. Крывога — начальніка юрыдычнага ўпраўлення Дзяржкампрацы, кандыдата юрыдычных навук; А. А. Луферава — члена Вярхоўнага суда РБ і іншых высокакваліфікаваных спецыялістаў.

Аб'яўляецца папярэдняя падпіска на «Каментарый»

Цана — 595 рублёў з коштам паслуг па перасылцы.
У сувязі з дэфіцытам паперы і вялікімі затратамі па выданню тыраж будзе абмежаваны, яго продаж у розніцу не прадугледжваецца.

ЖАДАЮЧЫМ ПАДПІСАЦЦА неабходна пералічыць грошы на р/р Беларускага кадравага цэнтра «Прафесіянал» № 345037 у Беларускім прамыслова-інавацыйным банку г. Мінска, МФО 400417, код 749,
І НАКІРАВАЦЬ НА АДРАС: 220100, г. Мінск-100, а/с 60 БКЦ «Прафесіянал» копію плацежнага даручэння з адзнакай банка аб пералічэнні з указаннем на адваротным баку бланка тэлефона і дакладнага паштовага адраса падпісчыка.

«КАМЕНТАРЫЙ» БУДЗЕ ВЫСЛАНЫ ПАДПІСЧЫКАМ НА ПРАЦЯГУ ТРОХ МЕСЯЦАЎ ПАСЛЯ ЗАЦВЯРДЖЭННЯ НОВАГА КЗаПа ВЯРХОЎНЫМ САВЕТАМ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

ДАВЕДКІ ПА ТЭЛЕФОНАХ У МІНСКУ: 26-27-30, 20-83-54.

ЗАБЫТЫЯ СТАРОНКІ

Кароткі агляд ваеннай гісторыі Беларусі

(Працяг. Пачатак у №№ 34—36).

Чарговая, трэцяя па ліку вайна пачалася ўжо ў 1506 годзе, калі Васіль III кінуў на край два шматтысячныя злучэнні, якія пустошылі Беларусь па Бярэзіну. У 1508 годзе ён прыслаў маскоўскія палкі пад Бабруйск на дапамогу здрадніку князю М. Глінскаму, каб на гэты раз зваяваць Беларусь супольна з бунтаўнікамі. Разам яны аблажылі Менск і адсюль рабілі спусташальныя рэйды ажно да Слоніма. Толькі з'яўленне К. Астрожскага, які ўцёк з маскоўскага палону, змусіла 30-тысячную армію непрыяцеля адступаць да Воршы, а пасля, збаяўшыся бітвы, і зусім пакінуць межы Беларусі. Восенню 1508 года маскоўскі манарх падпісаў новае пагадненне аб міры з Вялікім княствам Літоўскім. Аднак ізноў нядоўга трываў без вайны.

Ужо на лета 1512 года стала вядома, што вялікі князь маскоўскі рыхтуе чарговую інтэрвенцыю разам з нямецкім Ордэнам. Восенню галоўныя сілы Васіля III аблажылі Смаленск, а іншыя палкі пайшлі на Воршу, Друцк, пустошылі край ажно да Менска і Віцебска. Не авалодаўшы Смаленскам, але страціўшы падчас аблогі нямала жывой сілы, маскоўскі ўладар адвёў войска, а летам 1513 года распачаў новую наступальную кампанію. На гэты раз у дапамогу яму Святая Рымская імперыя прыслала сваю пяхоту і артылерыю. Разам пад Смаленскам зграмадзілася каля 30 тысяч ратнікаў. Але смаленцы настолькі мужна адбіваліся, што Васіль III праз колькі месяцаў мусіў зняць безвыніковую аблогу. Трэці смаленскі паход быў прызначаны на лета наступнага года. Маскоўская дыпламатыя разам з імператарам Максімільянам утварылі ваенную кааліцыю з сямі дзяржаў супраць Вялікага Княства Літоўскага і Кароны Польскай. У Маскве хаўрусніку вырашылі пасля перамогі падзяліць заваяваныя абшары: Васіль III забраў бы беларускія і ўкраінскія землі, а Максімільян I — польскія.

80-тысячнае войска прыйшло пад Смаленск у ліпені 1514 года і пачало няспынны абстрэл горада з 300 гармат. Праз колькі тыдняў абаронцы з палаючых умацаванняў папрасілі спыніць абстрэл, а яшчэ па якім часе згадзіліся капітуляваць на льготных умовах. Акрыленыя поспехам маскоўскія ваяводы паспяшаліся ўглыбкі Беларусі. Страта галоўнай фартэцы на ўсходзе ашаламіла Вялікае Княства Літоўскае. Пасля Смаленска паддаліся Мсціслаў, Крычаў, Дуброўна.

Войска Вялікае Княства — каля 35 тысяч — толькі падыходзіла да Бярэзіны. Ваяводы Васіля III, маючы больш чым двайную перавагу ў сіле, вырашылі даць генеральную бітву, каб цалкам разграміць харугвы К. Астрожскага і тады ўжо гаспадарыць у зусім безабароннай краіне. Яны зграмадзіліся за Дняпром, на беразе рачулкі Крапіўны, што паміж Воршай і Дуброўнай. На досвітку 8 верасня 1514 года перад імі з'явіліся шыхты войска К. Астрожскага. Пачалася бітва, ад якой залежаў гістарычны лёс беларусаў ды іншых народаў Вялікага Княства Літоўскага.

Гетман найвышэйшы, род якога паходзіў з Турава-пінскіх князёў, бліскуча скарыстаў сваё тактычнае майстэрства і дазвання разграміў агромністую армію Маскоўскай дзяржавы. Гэтая перамога стала абаронай суверэнітэту краіны. Святая Рымская імперыя адмовілася ад ваеннага блоку з Масквой, і ўвесь небяспечны альянс разваліўся. Пра перамогу К. Астрожскага над Масквой уведала ўся Еўропа. Яе святкаваў сам папа рымскі, а імператар Максімільян стаў абаронцам інтарэсаў Вялікага Княства Літоўскага на Захадзе. У 1518 годзе, пераконваючы магістра нямецкага ордэна не дапамагаць Маскве весці захопніцкія войны, ён напісаў: «Цэльнасць Літвы (чытай — Вялікага Княства Літоўскага) карысна для ўсёй Еўропы, магутнасць Масковіі — небяспечная». Славутая бітва на Крапіўне ўвайшла ў еўрапейскія хрэстаматыі па ваеннай гісторыі як узор перамогі малалікага войска над колькасна пераважаючым ворагам. А на Беларусі Аршанскую бітву апявала гістарычная народная песня, услаўлялі летапісцы. Гетмана К. Астрожскага называлі Сцыпіёнам, Ганібалам, а ягоных ваяроў параўноўвалі са славутымі македанянамі.

Вайна цягнулася яшчэ 8 гадоў, але маскоўскія ваяводы ўжо не здолелі дамагчыся поспеху. Хоць, праўда, і Вялікае Княства не змагло вярнуць Смаленска. У 1522 годзе ў Маскве была падпісана дамова аб 5-гадовым замірэнні.

Мір ледзь-ледзь вытрымліваўся. З боку Маскоўскай дзяржавы ўжо праз два гады ўрываліся аддзелы ратнікаў і рабавалі край — каля Мазыра, Рэчыцы, Чачэрска, Крычава, з'яўляліся ажно за Дняпром. Вялікі князь Жыгімонт пратэставаў супраць сістэматычнага парушэння мяжы, еўрапейскія краіны таксама заклікалі Маскву да спакою.

Пасля смерці вайўнічага Васіля III беларуска-літоўскае гаспадарства паспрабавала сілай забраць назад землі, захопленыя Маскоўшчынай у папярэдніх войнах. Яно ўльтыматыўна запатрабавала ад Масквы вярнуць Севершчыну і Смаленшчыну. Калі ж атрымала адказ, вялікі князь Жыгімонт у жніўні 1534 года скіраваў адно войска на Смаленск, другое — на северскія гарады. Але наяўных сілаў было замала, каб дамагчыся значнага поспеху. Лепш падрыхтаваная, мабілізаваўшая на вайну ці не ўвесь свой патэнцыял, Маскоўская дзяржава кінула на Беларусь тры арміі — ад Пскова, Смаленска і Старадуба. Абмінуўшы гарады і замкі, яны дайшлі ажно да Браслава і Навагрудка, рабуючы і спальваючы, забіваючы і хапаючы ў няволю. Тады на лета Вялікае Княства правяло новую наступальную кампанію: вызваліла Гомель, затым іншыя гарады, заняло ўсю Северскую зямлю. Але маскоўскія ваяводы ізноў ударылі па Беларусі — пустошылі Полаччыну, Падняпроўе. Войска Вялікага Княства пакінула занятыя землі і вярнулася, затрымаўшы за сабой адзін Гомель. У 1537 годзе дайшло да падпісання пяцігадовага замірэння. Толькі Гомель і быў вернуты Беларусі.

На гэты раз спакой на межах Беларусі з Маскоўскай дзяржавай патрываў даўжэй — некалькі дзесяцігоддзяў. Тая перадышка стала зацішшам перад вялікай бурай. Маскоўшчына рыхтавалася да новых захопаў, і разам з сілай раслі яе апетыты: цяпер нават Віленшчына і інфлянты ўжо абвяшчаліся «вотчынай» маскоўскіх уладароў.

У 1558 годзе першы маскоўскі цар Іван IV Грозны распачаў вайну з нямецкім ордэнам, каб заняць узбярэжжа Балтыйскага мора. Магістр ордэна Кетлер папрасіў дапамогі ў еўрапейскіх дзяржаў, аднак уступіцца за інфлянты пагадзілася толькі Вялікае Княства Літоўскае. Так дайшло да чарговай вайны паміж Маскоўшчынай і беларуска-літоўскай дзяржавай. Ужо на пачатку 1562 года царскія палкі спустошылі Мсціслаўшчыну, ваколіцы Шклова, Воршы, Віцебска, а праз год сам цар з 60-тысячным войскам прыйшоў і аблажыў Полацк. Маленькая полацкая залога два тыдні мужна адбівалася, але драўляныя ўмацаванні гарэлі, а дапамогі чакаць не было адкуль: гетман Мікалай Радзівіл меў пад рукой толькі тры з паловай тысячы вершнікаў. 15 лютага Полацк мусіў здацца. Пад акупацыяй апынулася амаль уся паўночная Беларусь. І хоць у студзені 1564 года на полі каля вёскі Іванск, што пад Улаю, 10-тысячны корпус М. Радзівіла дазнаўся разбіў 30-тысячнае маскоўскае войска, Вялікае Княства Літоўскае заставалася ў складаным становішчы. Акупанты нішчылі землі, выводзілі ў палон насельніцтва (толькі з Полацка — больш за 11 тысяч), а выбіць іх з Беларусі ды іншых тэрыторый не хапала сілаў. Гэта было ці не галоўнай прычынай таго, што Вялікае Княства Літоўскае пагадзілася аб'яднацца на канфедэратыўнай аснове з Польскім каралеўствам. Так у 1569 годзе была ўтворана новая дзяржава — Рэч Паспалітая. Аб'яднаныя сілы за 1579 і 1580 гады вызвалілі Полацк, выгналі акупантаў з усіх раёнаў Беларусі і прымусілі Івана Грознага падпісаць у 1582 годзе мірнае пагадненне, якое юрыдычна замацоўвала безвыніковасць агрэсіі. Так, за XVI стагоддзе ў беларускай гісторыі з прыкладна 40 ваенных гадоў каля 35 выпала на войны з Маскоўскай дзяржавай. І пад час амаль кожнай з іх тэатрам ваенных дзеянняў была Беларусь. Тым не менш народ не толькі вытрымаў гэтае жорсткае выпрабаванне на жыццяздольнасць, але яшчэ і высока ўзняў сваю гаспадарку і культуру. На Беларусі з'явіліся першыя з усходнеславянскіх друкарняў, на старабеларускай мове друкаваўся Статут Вялікага Княства Літоўскага — адзін з найбольш дасканалых кодэксаў феадальнага права Еўропы, а вырабы беларускіх рамеснікаў карысталіся попытам далёка за межамі краіны.

Пачатак XVII стагоддзя азначыўся новым працяглым канфліктам з Маскоўскай дзяржавай. У 1604 годзе магнаты і шляхта Рэчы Паспалітай скарысталі падтрымку маскоўскага баярства і ажыццявілі паход на Маскву. Беларусь стала плацдармам ваенных дзеянняў. У 1607 годзе пачаўся другі паход на Маскву, а ў 1609 — кампанія па вяртанню Смаленска. Вярнуўшы гэты горад, войска Рэчы Паспалітай у 1610—1612 гадах валодала самой Масквой і прымусіла ў 1618 годзе царскі ўрад падпісаць пагадненне аб замірэнні, паводле якога Вялікаму Княству Літоўскаму былі вернуты Смаленск, Чарнігава-Северская зямля, гарады Дарагабуж, Мажайск, Вяазьма. Так этнічна беларускія землі ўз'ядналіся з асноўнай тэрыторыяй краіны.

Але ўжо ў 1632 годзе маскоўскі ўрад ізноў парушыў замірэнне і кінуў войска на ўсходнюю і паўночную Беларусь. Галоўнай мэтай гэтай вайны быў захоп Смаленска, але, скарыстаўшы зручны момант (у Рэчы Паспалітай якраз памёр манарх), царскія ваяводы паспелі пагаспадарыць і ў іншых раёнах Беларусі: захапілі Невель, Себеж, Сураж, Друю, Мсціслаў, Крычаў, спрабавалі здабыць Полацк. Невялічкая залога Смаленска (2—3 тысячы) гераічна вытрымала аблогу 32-тысячнай маскоўскай раці. Калі ў смаленцаў скончыліся боезапасы і хлеб, ім дапамагалі жыхары Магілёва, якія забяспечвалі абаронцаў порахам, кулямі, усім неабходным. А на восень 1633 года да Смаленска прыйшла нарэшце вайсковая дапамога. У хуткім часе ўся маскоўская армія была акружана і — капітулявала. Такое буйное паражэнне царскіх ваяводаў клала канец вайне. Увесну 1634 года абодва бакі падпісалі замірэнне на 20 год, якое пакідала нязменнымі ўсходнія межы беларуска - літоўскай дзяржавы.

Задоўга да канца вызначаных 20 год замірэння царскі ўрад пачаў актыўную падрыхтоўку да вялікай інтэрвенцыі. За мяжой агромністымі партыямі закупалася зброя, вербаваліся вайсковыя кадры, у самой Маскоўскай дзяржаве ўтваріліся новыя палкі. І калі ў 1654 годзе царскія ваяводы рушылі з войскам на Беларусь з трох напрамкаў, абараніцца не было як: маскоўскай арміі, якая з украінскімі казакамі налічвала 100 тысяч, супраць стаяла войска Вялікага Княства ў 10 тысяч ваяроў...

(Працяг будзе).

Галоўны рэдактар У. Б. НАРКЕВІЧ.

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь, калектыў рэдакцыі газеты «Звязда».

НАШ АДРАС: 220041, гор. Мінск, праспект Ф. Скарыны, 77, рэдакцыя газеты «Звязда».

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай — 32-51-05, аддзела пісьмаў—32-04-52, 32-41-92, навін—32-15-02, даведкі па рэкламе і аб'явах — 32-35-91.

ПА НУМАРУ ДЗЯЖУРЫЛІ: член рэдакцыйнай калегіі Іван Бараноўскі, першы намеснік адказнага сакратара Яўген Ляхаў, старшы карэктар Ала Сабалеўская.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі.
Рэдакцыя пакідае за сабой права не ўступаць у перапіску з чытачамі.

Друкарня выдавецтва «Беларускі Дом друку». Тыраж 81.098. Індэкс 63.850. Зак. № 37. Выходзіць 250 разоў на год. Нумар падпісаны ў 21.05.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

ЧЫСЦІНЯ І ПАРАДАК — ВАША ВІЗІТНАЯ КАРТКА

Як даглядаць аконнае шкло і люстэркі

* Аконнае шкло ў пакоях і на кухні заўсёды павінна быць чыстым. Ад гэтага залежыць не толькі асветленасць, але і ў нейкай меры тэмпература ў памяшканні. Аконнае шкло рэкамендуецца перыядычна праціраць мяккай шарсцяной анучкай, злёгку змочанай ільняным маслам (яго можна купіць у магазіне мастацкіх фарбаў), а затым насуха выціраць сухой шарсцяной або баваўнянай тканінай ці прамакальнай паперай. Зручныя для гэтых мэт і спецыяльныя сурвэткі для чысткі шкла.

* Чысціць аконнае шкло рэкамендуецца ў неспякотнае і бязветранае надвор'е, бо ў яркі сонечны дзень і на ветры шкло сохне вельмі хутка і на ім пасля чысткі могуць з'явіцца разводы.

* Перад чысткай аконнага шкла рамы і падаконнік трэба працерці мяккай анучкай, каб зняць пыл, а ў выпадку неабходнасці іх старанна мыюць.

* Для мыцця аконнага шкла, рам і падаконнікаў (апрача выпускаемых прамысловасцю прэпаратаў «Свет», «Нітхінол» і інш.) прымяняюць звычайны нашатырны спірт (на 1 літр вады 2 сталовыя лыжкі спірту). Гэтым растворам анучкай або губкай мыюць шкло, рамы і падаконнікі, а затым выціраюць іх чыстай тканінай, якая не пакідае на шкле слядоў, або пакамечанай газетнай паперай.

* Калі шкло забруджана не моцна, яго можна мыць растворам крухмалу ў халоднай вадзе (1 сталовая лыжка на 1 літр вады).

* Моцна забруджанае шкло можна вымыць растворам хлорнай вапны (50 грамаў на 1 літр вады).

* Стары і надзейны сродак для чысткі шкла —парашкападобны мел або зубны парашок. 2—3 сталовыя лыжкі мелу добра перамешваюць у шклянцы вады, змочваюць анучку і праціраюць ёю шкло з абодвух бакоў. Калі шкло высахне, яго праціраюць сухой мяккай тканінай або паперай да поўнага зняцця мелу.

* Хутка ачысціць замёрзлае аконнае шкло можна моцным растворам кухоннай солі ў халоднай вадзе (2 сталовыя лыжкі солі на 1 шклянку вады). Гэтым растворам праціраюць шкло да таго часу, пакуль з яго не сыдзе лёд, пасля чаго шкло выціраюць сухой мяккай тканінай.

ЯК БЫЦЬ ПРЫГОЖАЙ

Вам, дзелавыя жанчыны

У апошнія гады ўсё часцей узнікае пытанне: ці можа і ці павінна жанчына-кіраўнік карыстацца дэкаратыўнай касметыкай, духамі, насіць моднае адзенне, ці патрэбна ёй так ужо старанна качыць за сваім выглядам. Здавалася б, як можа быць інакш?

Але ў 30—50-я гады гэтае пытанне вырашалася не на карысць жанчыны. Лічылася нават, што жанчына-дырэктар павінна «забіваць» у сабе ўсе жаночыя якасці, ніколі не ўсміхацца, быць антымоднай, насіць туфлі без абцасаў, доўгія сукенкі пры модзе на кароткія ці наадварот — кароткія, калі мода падказвала, што адзенне павінна быць больш доўгім. На шчасце, гэта ўжо ў мінулым. Сучасная жанчына заўсёды і ва ўсім павінна заставацца жанчынай, а жанчына-кіраўнік павінна быць узорам для сваіх калег не толькі ў пытаннях навукі ці вытворчасці, але і знешняга выгляду, бо добрая ўсмешка, сціплая элегантнасць — гэта, перш за ўсё, памяркоўнасць і добры густ.

Макіяж дзелавых жанчын павінен быць лёгкім і няяркім. Колер скуры — светлы, лепш гэтага дабіцца з дапамогай рассыпной пудры, таму што тон праз гадзіну-паўтары пасля нанясення на твар збіраецца і падкрэслівае маршчыны. Бровы не павінны быць цямнейшымі за валасы. На павекі наносяцца цені светла-блакітнага колеру. Губная памада светлая. Румянамі лепш не карыстацца наогул, ці нанесці і старанна растушаваць сухія румяны светлага тону, якія адпавядаюць тону губной памады.

Колер валасоў максімальна набліжаецца да натуральнага ці на 1—2 тоны святлейшы. Сівым валасам можна надаць прыгожае адценне.

Сакрэты вечнай маладосці

Каб заўсёды застацца маладой, ТРЭБА:
1. Мала есці. 2. Часцей есці рыбу. 3. Піць набольш вады.

4. Займацца спортам 5. Як мага больш хадзіць. 6. Дыхаць свежым паветрам. 7. Дастаткова спаць. 8. Больш смяяцца. 9. Захаваць тонкую талію. 10. Нарадзіць дзіця ў 40 гадоў. 11. Падарожнічаць. 12. Стаць маладой і прыгожай бабуляй. 13. Любіць жыццё.

І НЕ ТРЭБА:

1. Пераядаць. 2. Ужываць алкаголь. 3. Шмат курыць. 4. Сядзець дома. 5. Глядзець гадзінамі тэлевізар. 6. Аддавацца змрочным думкам. 7. Крыўдзіцца на акружаючых. 8. Апранацца ў цёмныя тоны. 9. Насіць звышвысокія абцасы. 10. Губляць пачуццё гумару. 11. Лаяць маладых. 12. Баяцца новага. 13. Эканоміць пачуцці.

Любімыя духі

Роданачальнікам духоў лічыцца адэкалон. З Іспаніі ён перабраўся ў Італію, а ў пачатку XVIII стагоддзя «пахучай вадой» праславіўся Кёльн. Пазней пахучая вадкасць пачала распаўсюджвацца ў краінах Еўропы пад французскай назвай «адэкалон» — вада з Кёльна. Потым з'явіліся і духі.

Класічныя правілы рэкамендуюць бландзінкам пахі больш лёгкія, кветкавыя. Брунеткі ж могуць аддаць перавагу духам з цяжкім экзатычным пахам. Аднак правілы гэтыя вельмі ўмоўныя — бо колькі людзей, столькі ж і густаў. Як бы там ні было, у кожнай жанчыны павінны быць любімыя духі.

Купіць духі няцяжка — на прылаўках парфумерных магазінаў мноства флаконаў і флакончыкаў. Але трэба яшчэ ўмець правільна карыстацца імі. Вось парады балгарскіх спецыялістаў.

* Выбіраючы новыя духі, не нюхайце адзін за адным шмат флаконаў, інакш вы хутка не здолееце адрозніць адзін пах ад другога. Таму, пакуль не спыніцеся на чым-небудзь, абмяжуйцеся пробнымі флакончыкамі.

* Нельга пераносіць духі на скуру, нядаўна працёртую адэкалонам. Духі і адэкалон несумяшчальныя.

* Змачыўшы тканіну ці валасы, не спрабуйце адразу ж зрабіць вывад, ці спадабаецца вам гэты пах. Пачакайце крыху — сапраўдны пах праявіцца толькі хвілін праз пятнаццаць.

* Мацней за ўсё пах успрымаецца вясной і летам. Увосень і зімой наш нюх крыху зніжаны. У гэты час года духамі можна карыстацца больш актыўна.

* На светлым адзенні духі нярэдка пакідаюць плямы. Памятайце пра гэта і будзьце акуратнымі. А яшчэ лепш прышыць да ўнутранага боку вопраткі кавалачак шарсцяной тканіны — яго і трэба змочваць духамі. Можна павесіць у шафе марлю, змочаную духамі, — гэты пах пройдзе на адзенне.

* Злоўжываць духамі і пахнуць, быццам парфумерны магазін, — прыкмета дрэннага густу.

ВАША ЗДАРОЎЕ

«Я спакойны, зусім спакойны...»

Але спакойным, пагадзіцеся, сёння быць надзвычай цяжка. Шалёныя цэны, схуднелы кашалёк, пошук хлеба надзённага і бясконцыя чэргі, даўка ў транспарце... А вынік адзін — узвінчаныя нервы, галаўны боль, бяссонніца.

Давайце паспрабуем проціпаставіць жыццёвым стрэсам мудрую народную медыцыну. Што яна раіць?

Прыйшоўшы дамоў, адразу паспрабуйце зняць раздражняльнасць, нервовае ўзбуджэнне. У прынцыпе зрабіць гэта нескладана. Напрыклад, калі ёсць час, прыміце цёплую ванну. Добра дадаць у яе адвар з кветкавага сена (500 г сена заварваюць 3 літрамі кіпню, запарваюць на 15 мінут, працэджваюць і ўліваюць у ванну). Тэмпература вады ў ванне не павінна перавышаць 36—38 градусаў, працягласць яе — 15—20 хвілін.

Можна прыгатаваць ванну з рамонкам. У гэтым выпадку кветкі рамонку заліваюць халоднай вадой і кіпяцяць у шчыльна закрытай пасудзе 10 хвілін. Колькасць кветак: для поўнай ванны — 1/2 кг, для палавіннай — 1/4 кг.

Эфектыўныя ванны з каранямі аера (для поўнай бяруць 1/4 кг, для палавіннай — 1/8 кг), валяр'янай (1/2 кг), лавандавымі кветкамі (100 г), чабаром (200 г).

Дапусцім, з ваннай не атрымліваецца. Нічога страшнага — хуценька заварыце чай на травах. Можна, у прыватнасці, выкарыстаць такі збор: валяр'яна, сардэчнік, мята, святаяннік. Засыпце ў сухі фарфоравы чайнік патрошку кожнай травы і заліце шклянкай крутога кіпню. Праз 20 хвілін працадзіце — чай гатовы.

А яшчэ лепш прыгатаваць настой раней, скажам, раніцай, перад работай. Трэба ўзяць па 3 часткі глогу, сардэчніку, сушаніцы і частку рамонку. Сталовую лыжку здробненай сумесі заварыце шклянкай кіпню. Няхай настойваецца на працягу 8 гадзін, затым працадзіце. Гэты заспакойваючы сродак наогул добра прыняць рэгулярна — па паўшклянкі 3 разы ў дзень праз гадзіну пасля яды. Дарэчы, ён рэкамендуецца і пры захворваннях сэрца.

Здымае нервовае ўзбуджэнне таксама наступная сумесь: плады глогу — 2 часткі, кораню валяр'яны — 2 часткі, травы сардэчніку —3 часткі, травы крывавуніку — 3 часткі. Заварваем, як звычайна, а вось настойваем 5—6 гадзін. Прымаць па 1/4 шклянкі 4 разы ў дзень за 20—30 хвілін да яды.